БИБЛІЁТЭКА

Контр-рэвалюцыянэры--Рамзіны, Ларычавы, беларускія нац.-дэмакраты--Ластоўскія, Лёсікі і К° імкнуліся ўтапіць у крыві рабочых СССР

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 283 (3081)
ПЯТНІЦА, 5 сьнежня
1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзённа за выключэньнем чацьвяргоў

Супроць права-„лявацкага" блёку, за жалезнае адзінства бальшавіцкіх радоў!

«Апартуністыя усіх колераў, асабліва правыя, ужываюць новы манэўр, які вылуляецца ў фармальным прызнаньні сваіх памылак і фармальнай згодзе з генэральнай лініяй партыі, не пацьвярджаючы свае прызнаньне работай і змаганьнем за генэральную лінію, што на справе азначае толькі пераход ад адкрытага змаганьня супроць партыі да скрытага або чаканьне больш спрыяючага моманту для адкаўленьня атакі на партыю». Гэта сьцьвярджэньне XVI зьезду УсеКП(б) цалкам і поўнасьцю знайшло свае яскравае пацьверджаньне ў «дзейнасьці» апартуністых у час, які прайшоў пасьля зьезду. Правыя і «левыя» апартуністыя пачалі актывізавацца ў змаганьні супроць генэральнай лініі партыі, сталі на шлях двурушніцкай здрадніцка - падрыўной дзейнасьці (Рыцін, Нусінаў, Каўрайскі і інш.); упартае маўчаньне підэраў правага апартунізму (Рыкаў, Томскі і іншыя) выказвала салідарызацыю са здрадніцкай дзейнасьцю двурушнікаў. Паказаньне XVI зьезду УсеКП(б) на новыя манэўры апартуністых пацьвердзіліся, нарэшце, налуднасьцю выкрытага партыяй права - «лявацкага» блёку Сырцова-Ламінадзэ—Шацкіна.

Сутнасьць правага апартунізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, як кулацкай агентуры ў радох партыі, выкрыта ня толькі перад шырокімі партыйнымі масамі, але і перад усёй рабочай клясай, перад усімі працоўнымі.

Буйнейшыя перамогі партыі ў справе сацыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцальнай калектывізацыі, ушчэнт разьбілі прадраканьні правых апартуністых і выкінулі на сьметнік гісторыі іх гнілую, капітулянцкую ідэалёгію.

Посьпехі партыі на фронце разьвіцьця цяжкай індустрыі, на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі сталі магчымы толькі таму, што партыя да канца выкрывала паражэнцка - капітулянцкую ідэалёгію правых і вяла бязьлітаснае змаганьне на два фронты: супроць правага апартунізму, які прадстаўляе галоўную небясьпеку на даным этапе, супроць «левых» загібаў і супроць прымірэнчых адносін да ўхілаў.

Бяспрынцыпны права - «лявацкі» блёк Сырцова - Ламінадзэ - Шацкіна склаўся НА ПЛЯЦФОРМЕ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ, які зьяўляецца агентураю клясавага ворага. Правыя апартуністыя і іх «левыя» папітычныя прыяцелі аб'ектыўна ідэалёгічна змыкаюцца з РАМЗІНСКА - КАНДРАЦЬЦЕЎСКАЙ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯЙ. Гэта з усёй выразнасьцю пацьвердзілі сёнешнія дні, у якія пралетарыят Савецкага Саюзу судзіць агенту сусьветнага імпэрыялізму, які падрыхтоўвае інтэрвэнцыю—контр-рэвалюцыянэраў Рамзіных і К-о. Галоўны падсудны, шкоднік Рамзін у сваіх паказаньнях суду заявіў: «Адным з асноўных мэтадаў шкодніцтва зьяўлялася штучнае зьніжэньне тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі. Гэта лінія па свайм напрамку супадае з установкамі правага ўхілу ў камуністычнай партыі. ТАМУ ПРЫ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ШТУЧНА ЗРЭЗАНЫХ МІНІМАЛІСЦКІХ ПЛЯНАЎ, ПРАЗ ПЛЯНАВЫЯ І УРАДАВЫЯ ОРГАНЫ Ў ЦЭНТРЫ СТВАРАЎСЯ АРЫГІНАЛЬНЫ БЛЁК З ПРАВЫМА КАМУНІСТЫМІ, ЯКІ ВЕЛЬМІ ПАЛЯГЧАЎ ЦЭНТРУ ЗАЦЬВЯРДЖЭНЬНЕ ПАДОБНЫХ ПЛЯНАЎ». Гэта выразна паказвае, як правыя капітулянты сталі зброяй у руках шкодніцкіх элемэнтаў — агентаў інтэрвэнцыі. Шкоднікі з «прампартыі» высунулі і падтрымлівалі лёзунг: «усюды і ўсяляк падтрымліваць у савецкіх установах правых». З гэтага зусім ясна тое, што «...ажыцьцяўленьне лініі правых ухілістаў, якія зьяўляюцца аб'ектыўна агентурай кулацтва, азначала-б зрыў будаўніцтва сацыялізму і аднаўленьне капіталізму ў нашай краіне». (З пастановы 16 зьезду УсеКП(б).

Заснаваньне бяспрынцыпнага права-«лявацкага» блёку—ёсьць імкненьне рознакапёрных апартуністычных апазыцыйных элемэнтаў зрабіць новую расстаноўку сіл для атак на генэральную лінію партыі, скарыстоўваючы часовыя труднасьці, што выклікаюцца шпаркімі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва. Правыя і «левыя» апартуністыя ў сваім змаганьні супроць партыі дакацціліся да бяспрынцыпнага аб'яднаньня.

Апынуўшыся ў балоце апартунізму, згрупаваўшыся на пляцформе правых, фракцыянэры тыпу Сырцова, Ламінадзэ, Шацкіна, Стэна жанглююць «левымі» фразамі, імкнуцца імі прыкрыць махрова-правыя ўстаноўкі і ўстановачкі.

Наконт апартуністычнай «лявізны» тав. Сталін надзвычай выразна сказаў на XVI зьезьдзе УсеКП(б): «...Лявей» лініі партыі... нічога быць ня можа, можа быць толькі «левая» фраза, якая льле ваду на млын кулацка-капіталістычнай рэстаўрацыі. «Левая» гістэрыка заўсёды была адваротным бокам капітулянцкай панікі перад труднасьцямі сацыялістычнага будаўніцтва».

У сваім змаганьні супроць партыі, якое праводзілася пад лёзунгам «радыкальнай зьмены партыйнай лініі», за «звужэньне фронту капітальнага будаўніцтва», раўнаньня на «вузкія месцы», узводзячы паклёпніцтва на партыйнае кіраўніцтва і на органы пралетарскай дыктатуры, фракцыянэры з права-«лявацкага» блёку сталі на агідны шлях двурушніцтва і ашуканства партыі. Нават тады, калі ЦКК выклікала фракцыянэраў для высьвятленьня антыпартыйнай дзейнасьці права-«лявацкага» блёку, дык, як Сырцоў, так Ламінадзэ і Шацкін ужывалі ў сваіх адносінах да партыйнага кіраўніцтва тактыку двурушніцтва, тактыку ашуканства.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ І ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАНТРОЛЬНАЯ КАМІСІЯ УсеКП(б) ПАСТАНАВІЛІ ВЫКЛЮЧЫЦЬ СА СКЛАДУ ЦК УсеКП(б) СЫРЦОВА І ЛАМІНАДЗЭ, ВЫКЛЮЧЫЦЬ СА СКЛАДУ КАНТРОЛЬНАЙ КАМІСІІ ШАЦКІНА.

Гэтым рашэньнем цэнтральныя партыйныя органы, абапіраючыся на волю шырачэзных партыйных мас, выканалі пастановы УсесаюзНых зьездаў партыі аб дастасаваньні самых рашучых мер у адносінах да правых і «левых» апартуністых — двурушнікаў здрадніцкай партыі. Партыя, гэтым самым яшчэ раз бязьлітасна ўдарыла па правых і «левых» апартуністых, якія прадстаўляюць агентуру кулацтва ў радох партыі.

Зараз у яшчэ большай меры павінна быць павышана бальшавіцкая пільнасьць і насьцярожанасьць кожнага члена партыі супроць усялякіх адхіленьняў ад гэнэральнай лініі партыі.

КП(б)Б заўсёды была і застаецца верным атрадам непахіснай і маналітнай УсеКП(б), заўсёды была і застаецца вернай апорай ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у бязьлітасным змаганьні за генэральную лінію партыі. Уся камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі, разам з усёй УсеКП(б) яшчэ шчыльней згуртуецца вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі тав. СТАЛІНА ў сваім змаганьні за ленінізм, за поўную перамогу сацыялізму.

Месячнік беларусізацыі—у цэнтр увагі партарганізацыі

Месячнік праверкі беларусізацыі ўжо пачаўся. Першыя вестні з месц гавораць аб тым, што гэта работа ў большасьці арганізацый пакуль што не пастаўлена на адпаведную палітычную вышыню. Вакол месячніка праверкі беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцей не разгорнута яшчэ патрэбная масавая праца.

Зусім недапушчальна ідзе падрыхтоўка да месячніка праверкі беларусізацыі у вясковых партыйных арганізацыях. Пры такіх умовах падрыхтоўкі мы стаім перад небясьпекай зрыву пасобнымі арганізацыямі гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства.

Асноўным недахопам зараз зьяўляецца тое, што частка партыйных арганізацый абмежоўвалася толькі плянамі і ня прымае ніякіх мер для таго, каб упавязць работу па праверцы беларусізацыі з папулярызацыяй пастаноў партыі па нацыянальным пытаньні.

Нават ёсьць і такія пасобныя нахілы, каб у часе месячніка правесьці толькі праверачную работу, не завастраючы ўвагі на поўным выкананьні зазначаных недахопаў. Партыйныя арганізацыі раз і назаўсёды павінны пакончыць з такімі апартуністычнымі разважаньнямі асобных работнікаў, што:

— Месячнік праверкі беларусізацыі нельга ўвязаць з іншымі кампаніямі і важнейшымі палітычнымі задачамі, якія зараз стаяць перад партыйнымі арганізацыямі.

Такія разважаньні і настрої ёсьць ні што іншае, як недаацэнка важнейшых палітычных пастаноў партыі, як праяўленьне правага апартунізму на практыцы, як адмаўленьне ад ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі.

Разважаньні аб тым, што нельга ўвязаць гэту работу з важнейшымі палітычнымі задачамі, ёсьць па сутнасьці ні што іншае, як паздольнасьць увязаць пытаньні нацыянальнай палітыкі партыі з чарговымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Партыя ніколі не аддзяляла нацыянальнага пытаньня ад агульных задач пралетарскай рэвалюцыі. Партыя біла і будзе біць па такіх апартуністычных настроях.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб разгарнуць масавую растлумачальную работу вакол месячніка праверкі беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцей. Трэба ўсе планы пабудаваць, грунтуючыся на пастановах 16 зьезду УсеКП(б), XIII зьезду КП(б)Б і апошняга Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б. Работа на праверцы беларусізацыі павінна арганічна, непасрэдна зьвязвацца з непасрэдным ажыцьцяўленьнем гэтых пастаноў.

Праверачныя брыгады толькі тады выканаюць свае задачу, калі праверка фактычнага становішча беларусізацыі будзе непасрэдна злучана з дапамогай мясцовым партыйным арганізацыям. Патрэбна самым рашучым чынам ударыць па спробах акаёзіць работу, зьвязаную з месячнікам (абмежаваньне плянамі, цыркулярамі і г. д.), бо такія настроі фактычна змазваюць і зрываюць практычную работу партыйнай арганізацыі па пасьпяховым правядзеньні месячніка беларусізацыі.

Партарганізацыі павінны ў хутчэйшы тэрмін заоснаваць арганізацыю праверачных брыгад і накіраваньне іх на прадпрыемствы, установы і г. д. **Трэба самым шырокім чынам разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж ячэйкамі і раёнамі пры правядзеньні гэтай работы, забясьпечваючы ўцягненьне самай шырокай масы рабочых у справу арганізацыі і правядзеньня месячніка.**

Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што камсамольская арганізацыя яшчэ і дагэтуль не разгарнула шырокай работы да месячніка праверкі беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцей. ЦК ЛКСМБ толькі 3-га сьнежня даў раёнам дырэктывы ў гэтым пытаньні. Фактычна падрыхтоўчай работы камсамольская арганізацыя да месячніка беларусізацыі не праводзіла. **Трэба неадкладна выправіць гэты буйны прабел.**

Ажыцьцяўленьне нацпалітыкі партыі нямысьліма бяз упартага штодзённага змаганьня з рознага роду ўхіламі ад яе. Мы ўжо ня раз зьмяшчалі факты аб актывізацыі вялікадзяржаўнага шавінізму. У сёнешнім нумары газэты «Зьвязда» мы таксама падаем рад фактаў праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму. Партарганізацыям неабходна яшчэ больш энэргічна і рашуча мабілізаваць масы на змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе. Трэба, каб арганізацыі і падалей ні на хвіліну не аслабілі змаганьня з контр - рэвалюцыйным беларускім нацыянал - дэмакратызмам, выкрываючы яго контр - рэвалюцыйную сутнасьць. Рашуча выкрываючы контр-рэвалюцыйны твар беларускіх нацыянал-дэмакратаў — саюзьнікаў Рамзіна, саюзьнікаў і агентуры польскага фашызму, мы павінны разам з тым ні на хвіліну не аслабляць змаганьня з шавінізмамі ўсіх колераў і прымірэнчымі да іх адносінамі.

Задачы месячніка праверкі беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцяй надзвычай адказныя. Партарганізацыі павінны пранізаць усю сваю работу пытаньнямі ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі, рашучага змаганьня за чыстату генэральнай лініі партыі, увязваючы канкрэтную работу па месячніку з чарговымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

У сваёй практычнай рабоце партарганізацыі павінны поўнасьцю забясьпечыць выкананьне задач, якія пастаўлены ЦК КП(б)Б у гэтым пытаньні.

Гнеў і абурэньне працоўных БССР расьце

РЭЗАЛЮЦЫІ ПРАТЭСТУ Ў РЭДАКЦЫЮ ПАСТУПАЮЦЬ БЯЗУПЫННА

Агульнагарадзкі сход жанчын—членаў саюзу, жонак рабочых і служачых і дэлегатак гор. Клімавічы пратэстуюць супроць шкодніцкай контр - рэвалюцыйнай дзейнасьці «прампартыі», якая паставіла сваёй задачай аьвяржэньне савецкай улады і **абярнуць СССР у калёнію міжнароднага імпэрыялізму.**

Агульны сход жанчын патрабуе ад ураду вышэйшай меры пакараньня для шкодніку.

У адказ на шкодніцтва агульны сход жанчын адказвае яшчэ большай згуртаванасьцю вакол кампартыі па выкананьні дырэктыў за далейшае перабудаваньне сельскай гаспадаркі на аснове суцэльнай калектывізацыі. Адначасова сход сабраў 200 руб. на пабудову дырыжабля імя «Правды».

— Лазовіцкі агульны сход жанчын-дэлегатак ганьбіць здрадніцка - шкодніцкую дзейнасьць «прампартыі», гэтых наймітаў сусьветнага імпэрыялізму.

Працоўныя жанчыны абяцаюць узмоцніць калектывізацыю бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

Агульны сход патрабуе для шкодніку — агентаў французкага імпэрыялізму—вышэйшай меры пакарання — **расстрэлу.**

— Саматужнікі гор. Клімавічы, аб'яднаныя сыстэмай прамкааперацыі, катэгарычна пратэстуюць супроць контр-рэвалюцыянэраў — ламаможнікаў інтэрвэнтаў з «прампартыі» і патрабуюць для іх вышэйшай меры сацыяльнай абароны.

Сусьветны імпэрыялізм рукамі сваіх агентаў і лёкаяў задумаў павярнуць назад кола гісторыі і зьвергнуць уладу саветаў у першай у сьвеце пралетарскай дзяржаве — **СССР.**

У адказ на шкодніцтва і падрыхтоўку інтэрвэнцыі саматужнікі бяруць на сябе абавязацельства да канца асобнага кварталу **арганізаваць на менш 25 проц. усяго складу гарадзкіх арцеляй саматужнікаў ва ўдарныя брыгады,** і па-ударнаму выканаць кантрольныя лічбы па ўсіх заданьнях асобнага кварталу.

Саматужнікі заклікаюць усіх членаў на 100 проц. уступіць у рады Асавіяхіму. Агульным сходам выбраны гарадзкі штаб для кіраўніцтва работай па выкананьні ўзятых на сябе абавязацельстваў. Акрамя таго, **саматужнікі выклікаюць на сацэспаборніцтва па высунутых пытаньнях усе саматужныя арцелі Касьцюковіцкага і Хоцімскага раёнаў.**

Брыгада ЦК КП(б)Б на чале з т. Гантманам у В'цебску

(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

У Віцебск прыбыла брыгада Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б. У складзе брыгады член бюро ЦК КП(б)Б т. ГАНТМАН, намесьнік старшыні ЦКК КП(б)Б т. ІВАНОЎ і іншыя.

Учора, 4-га сьнежня ў Віцебску, з удзелам брыгады, пачала работу шырокая нарада па пытаньні нарыхтовак ільнавалакна, насеньня, пяньку, а таксама па пытаньні мабілізацыі сродкаў.

У рабоце нарады ўдзельнічаюць сакратары камітэтаў партыі буйных ільнаводных раёнаў, як Лёзна, Сураж, Сіроціна і г. д.

Паведамім аб рабоце нарады—у бліжэйшай карэспандэнцыі.

Зграя контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, б. міністраў, царскіх чыноўнікаў--кавала кайданы акупацыі для працоўных БССР

У адказ інтэрвэнтам яшчэ больш узмацнім абароназдольнасьць краіны, будзем напагатове!

Агенты сусьветнага капіталу--арганізатары інтэрвэнцыі і шкодніцтва--перад пралетарскім судом

МАСКВА. У 6 з палов. гадз. 4-га сьнежня спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага суда СССР аднавіла адкрытае насяджэньне. Перш, чым закончыць судовае сьледзтво, тав. Вашынскі прапануе бакам падаць падсудным дадатковыя пытаньні.

— Якая доля грашовых сродкаў, атрыманых на шкодніцкую дзейнасьць, паступала непасрэдна на аплату «работы членаў ЦК «прампартыі»?—пытае тав. Крыленка падсуднага Рамзіна.

Рамзін: «Работа членаў ЦК не аплачвалася. Я, прынамсі, нічога не атрымліваў і лічыў, што і ўсе члены ЦК працуюць безвазмездна».

На тое-жа пытаньне тав. Крыленка адказвае **Ларычаў:** «Працаваў безвазмездна... Брацьгрошы лічыў ніжэй годнасьці...».

А другім даваць лічыці годным?—задае пытаньне тав. Крыленка.

— На жаль, так—адказвае Ларычаў.

Падсудны **Кыпрыянаў,** наадварот, прызнае, што грошы атрымліваў і ўсяго ён атрымаў **12.500 руб. Фядотаў** таксама прызнаецца, што атрымліваў грошы, як член ЦК. Я думаў, што і ўсе іншыя члены ЦК атрымлівалі грошы таксама, як і я. Цьверджаньне, што працавалі бескарыстна я тут сёньня чую ўпяршыню,—заўважае Фядотаў. 12.000 руб. «узнагроды» атрымаў і **Сітнін.**

— А вам перапала што-небудзь?—пытае тав. Крыленка падсуднага Очкіна.

— Не... адказвае Очкін.

— Чаму? Вас абышлі?—пытае тав. Крыленка.

Рамзін: Очкін быў у шкодніцкай групе. Гэта група атрымлівала грошы. І Очкіну ня было падстаў не атрымліваць грошай...—гаворыць Рамзін пасьля пекатарай заміпкі.

ЮРОЎСКІ ДАЕ ПАКАЗАНЬНІ

ШКОДНІК АСАДЧЫ

Дзяржаўнае абвінавачаньне хадайнічае аб далучэньні да справы раду розных дакумантаў з правам спасыланьня на іх ў часе спрэчак бакоў. Тут два нумары белагвардзейскай газэты «Возрождение» ад 12 і 15 чэрвеня, якія зьмясьцілі выступленьне Гэнры Дэтэрдынга на сьвяткаваньні дзесяцігодзьдзя «Торгпрома» ў Парыжы, у якім ён проста паказвае на тое, што «зьвяржэньне савецкай улады—справа некалькіх месяцаў», у гэтага газэце і ў французкай «Ліберэ»—апісаньне «белогвардейских торжеств», з прычыны гадавіны заключэньня перамір'я, дзе выступалі выдатныя прадстаўнікі белагвардзейскай генэральскай клікі з надобнымі-ж цьверджаньнямі.

Прадстаўнік абароны тав. **Оцэп** просіць прадставіць магчымасьць абароне спасылацца на тэксты судовых прыгавораў па шахцінскай справе і СВУ, а таксама на цытату з «Праўды» ад 21 красавіка мінулага году, прысьвечаную працэсу шахцінскай справы. Акрамя таго, абарона просіць суд далучыць да справы вытрымкі з брашур «Нашы ворагі аб пяцігодцы», выданай Камакадэміяй.

Спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага суда пастанавіла задаволіць усе хадайніцтвы абвінавачаньня і абароны.

Пасьля 10-мінутнага перапынку суд, закончыўшы судовае сьледзтва, прыступіў да спрэчак бакоў. Слова атрымлівае дзяржаўны абвінавайца тав. **Крыленка.**

„Да апошняй кроплі крыві будзем абараняць Савецкі Саюз"--заяўляюць рабочыя Чэха-Славакіі

ПРАГА, 3. Сёньня ў 7 гадзін вечара адбыўся арганізаваны кампартыяй вялікі мітынг пратэсту ў сувязі з працэсам «прампартыі». Першым выступіў з прамовай, спатканы бурнымі воплескамі 2-х тысяч рабочых, камуністычны дэпутат **Готвальд,** які заявіў:

Працэс яшчэ раз выкрыў крывадушнасьць буржуазіі, якая галасіла аб мнімым уміяшаньні СССР у справы іншых краін. Імпэрыялісты вядуць адкрытую падрыхтоўку ўзброенай інтэрвэнцыі. **Інтэрвэнцыю падрыхтоўвае Францыя,** якая зьяўляецца саюзьніцай Чэха-Славакіі. Апошняя зьвязана ваеннымі дагаворамі таксама з Румыніяй і з Польшчай. Капіталісты гуляюць ва банк і хочуць зьнішчыць СССР. Рабочыя заяўляюць: **Савецкі Саюз —наш!** (бурныя аплёдысменты). Мы заяўляем, што **да апошняй кроплі крыві будзем абараняць Савецкі Саюз** (бурныя авацыі ўсяе залі). Мы папярэджваем, што ў выпадку вайны, буржуазія знойдзе ворагаў ва ўласнай краіне» (аплёдысмэнты).

Пры ўсеагульным ўздыме Готвальд гаворыць далей:

«Буржуазія хацела-б расколу УсеКП(б). Мы адказваем, — няхай жыве адзіная магутная Ўсесаюзная Камуністычная партыя! Няхай жыве тав. Сталін! **У Маскве на лаўцы падсудных ня толькі 8 членаў «прампартыі», але і ўвесь сусьветны імпэрыялізм. Задача рабочых Чэха-Славакіі ажыцьцявіць прыгавор над галоўным вінаватым—капіталізмам».**

Пасьля Готвальда выступіў член капэрацыйнай делегацыі **Томан.** Делегацыя толькі сёньня вярнулася з СССР. Прамова Томана, жывога сьведкі таго, што адбываецца ў апошнія дні ў Маскве, надавычай наэлектрызавала рабочых. З асаблівым захапленьнем было прынята прывітаньне савецкіх бальшавікоў Томан заявіў:

«Буржуазія падняла шум аб паўстаньнях, якія нібы адбываюцца ў СССР. **Мы шукалі іх і не знайшлі.** Мы прысутнічалі на дэманстрацыі ленінградзкіх рабочых, у якой прымала ўдзел 750.000 чалавек, патрабаваўшых суровага пакараньня шкодніку. Дэманстранты ішлі за калёнамі трактараў — сымбалем сацыялістычнага будаўніцтва. **Пасьля бачнага ў СССР мы верым, што рабочыя выканаюць пяцігодку за чатыры гады».**

Мітынг быў распушчан пасьля таго, як, атрымаўшы слова, рэдактар камуністычнай газэты **«Рудэ право»** фучых прапіпаставіў клясавую палітыку СССР палітыцы Чэха-Славакіі.

Ва ўсёй Чэха-Славакіі ідзе хваля пратэстаў супроць роспуску «саюзу» прыхільнікаў СССР». **Рабочыя патрабуюць суровага пакараньня шкодніку з «прампартыі» і вітаюць АДПУ і т. Сталіна.** Рэзалюцыі такога-ж зьместу паступілі ад камітэту беспрацоўных у Пільзэне, ад рэвалюцыйных мэталістаў заводаў «Шкода» ў Пільзэне, праскага заводу «Мэва», ад бязбожнікаў гораду Прагі, ад жонак пралетараў праскага раёну «Нусьле», ад гарняноў капальні «Крыміх» недалёка ад Пільзэна і з раду іншых месц.

(ТАСС).

На пралетарскі суд б. натхніцеляў крывавага бандыта Булак-Балаховіча

Заслухаўшы інфармацыю аб выкрытай і арыштаванай контр - рэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нацыянал-дэмакратаў, **рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал бабруйскага камбінату** ганьбіць здрадніцкую рабочае клясы, якія імкнуліся абарынуць БССР у калёнію Польшчы.

— Ніякім Лёсікам, Ластоўскім, Цьвікевічам, Рамзіным ня ўласна сынішць магутнага сапфуда ціцтва першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы — заяўляюць у сваёй рэзалюцыі рабочыя.

Мы патрабуем ад ураду суровага пакараньня здраднікам рабочае клясы — агентам польскага фашызму.

Мы заклікаем да яшчэ большага напружаньня сіл і энэргіі па паскарэньне тэмпаў нашага будаўніцтва, памятаючы, што кожны недавыкананы пункт прамфінпляну грае на руку нашаму ворагу і аслабляе магутнасьць Савецкага Саюзу, а выкананьне і перавыкананьне яго робіць непрыступнай краіну Саветаў.

Шчыльней рады, мацней удар па недахопах, на пралетарскі суд агентаў міжнароднага імпэрыялізму — дапаможнікаў інтэрвэнтам беларускіх нацдэмаў.

Наймітам і саюзьнікам польскага фашызму ня можа быць літасьці

Мазырская міжсаюзная раённая канфэрэнцыя ІТР з абуранньем адзначае, што гандляры крывёю рабочых, бядняцка - серадняцкіх мас Савецкай Беларусі, былыя міністры былога фашысткага ураду «Народнай рэспублікі», клюнапаклоньнікі Вільгэльма, контр-рэвалюцыйныя нацыянал - дэмакраты вялі падрыўную работу, імкнучыся сарваць перамоганае сацыялістычнае будаўніцтва у Савецкай Беларусі, каб мець магчымасьць зварот капіталістых і памешчыкаў у свае маёнткі.

Канфэрэнцыя лічыць, што гэтым наймітам і саюзьнікам польскага фашызму ня можа быць літасьці.

Канфэрэнцыя вітае вернага партыйнага рэвалюцыі—ДЦУ Беларусі, якая выкрыла гэтую контр-рэвалюцыйную групу, патрабуе для ўсіх — нацыянал-дэмакратаў суровага пакараньня.

Канфэрэнцыя запэўняе, што арганізацыі ІТР, скінуўшы з сябе рэшткі апалітычнасьці, нейтральнасьці, разам з рабочай клясай, над кіраўніцтвам партыі, яшчэ з большай энэргіяй возьмуцца за пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну асобна па ўдарнага кварталу.

Наперакор шкодніцтву пяцігодка будзе выканана, пры тым не за 5, а за 4 гады

(Інтэрвію намесьніка старшыні СНК і старшыні Дзяржпляну СССР тав. **Куйбышава** аб пяцігодцы, данае прадстаўніку ПАЗШ агенцтва „Асошыейтэд Прэс")

У сваім інтэрвію прадстаўніку ПАЗШ агенцтва «Асошыейтэд Прэс» тав. Куйбышаў паказаў, што ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі ёсьць вялізарныя дасягненьні, што намячэньні пяцігадовага пляну сацбудаўніцтва ў некаторых галінах народнае гаспадаркі ўжо зараз выкананы. Так, па плянаванай прамысловасьці для двух год разам пяцігодкі меркавала прадукцыю ў пяьменных цэнах у разьмеры **29 мільярдаў 338 мільёнаў рублёў,** а выявілася фактычна **30 мільярд. 456 млн. рублёў.** Асабліва значна перавыкананьне пяцігодкі за два гады ў галіне прадукцыі **цяжкай індустрыі.** Замест заданьня пяцігодкі на гэтыя два гады **12.476 млн. руб.,** выканана **13.764 млн. рублёў** прадукцыі. Па асобных галінах цяжкай індустрыі перавыкананьне праграмы пяцігодкі за два гаты разам склала: **па нафце** меркавалася пяцігодкай **28 млн. тон,** аказалася фактычна **30,6 млн. тон, па сталі—9,9 млн.** тон паводле пяцігодкі і **10,2 млн. фактычна, па пракаце** меркавалася паводле пяцігодкі **7,6 млн. тон,** аказалася фактычна **8,3 млн., па электратэхніцы** меркавалася пяцігодкай пра дукцыі ў разьмеры **588 млн. руб.,** а аказалася **781 млн.** рублёў. Па **с.-г. машынабудаўніцтве** меркавалася паводле пяцігодкі **472 млн. рублёў** прадукцыі, а фактычна аказалася **515 млн. рублёў.** Перавыкананьне за два гады мела месца таксама па агульным машынабудаўніцтве. Хаця ўжо ў першым годзе пяцігодкі аказалася перавыканай, але аса бліва значныя былі посьпехі сацыялістычна прамысловасьці ў другім годзе пяцігодкі: прырост валавой прадукцыі за 1929-30 год склаў 22 проц., вышэй, чым па праектаваньні пяцігадоваага пляну на 5 проц. Пры гэтым трэба асабліва падкрэсьліць прырост прадукцыі па галінах, выраблякчых **сродкі вытворства,** прырост склаў у мінулым годзе 40 проц., тым самым перавысіўшы праектаваньне пяцігадоваага пляну на гэты год **на 16 проц.** Па важнейшых галінах прамысловасьці суадносіны выкананьня з вызначаным пяцігадовым планам прадстаўляюцца ў такім выглядзе: **здабыча нафты перавысіла заданьне** пяцігадоваага пляну **на 39 проц.** і г. д. Каравцей кажучы, па важнейшых галінах прамысловасьці мы ідзем са значным перавышэньнем праектаваньняў пяцігадоваага пляну.

Калі выкананьне будаўнічай праграмы ў першым годзе пяцігодкі ішло ў асноўным на ўзроўні пяцігодкі, пачынна перавышаючы яе, дык у другім годзе, г. зн. у 1929-30 г., заданьне пяцігодкі аказалася разка перавыкананым: замест **2.331 млн. рублёў** паводле пяцігодкі на гэты год, фактычна выкананьне будаўнічай праграмы прамысловасьці склала **2.965 млн.** рублёў, г. зн. **на 27 проц. больш,** чым паводле пяцігодкі. Такое значнае перавышэньне пляну фабрычна-заводзкага будаўніцтва, вызначанага пяцігодкай, забясьпечвае і далейшае паскарэньне тэмпаў прамысловага разьвіцьця і робіць бязумоўна рэальным выкананьне лёзунгу: «Пяцігодка—за чатыры гады», а па цэлым радзе важнейшых галін прамысловасьці—за 3—3½ гады **(вугаль, машынабудаўніцтва, нафта** і г. д.).

Вельмі значнымі аказаліся нашы посьпехі і ў галіне **сельскае гаспадаркі.** Пасеўныя плошчы ўзраслі з **118 млн. гэктараў** у 1928-29 г. да **127,7 млн.** гэктараў у 1929-30 годзе. Па культурах пасеўныя плошчы аказаліся значна вышэй праектаваньняў пяцігодкі, па **цукровых буракох—на 11,1 проц., па бавоўне—на 23 проц.** і г. д. Паленшчная апрацоўка зямлі, асабліва ў калгасах і саўгасах, і ў сувязі з гэтым рост ураджайнасьці прывялі да таго, што валавы збор збожжа ў 1930 годзе склаў 86,5 млн. тон, супроць 71,7 млн. тон у 1929 годзе, або павялічэньне **на 20,6 проц.,** а таварная прадукцыя збожжавых культур аказалася на 32,6 проц. вышэй праектаваньняў пяцігадоваага пляну. Такім чынам, збожжавая праблема аказалася ў асноўным вырашанай. **Буйнейшыя посьпехі тут—просты рэзультат буйнейшых посьпехаў, дасягнутых у галіне калгаснага і саўгаснага будаўніцтва.** Калі ўзяць усе віды сялянскіх гаспадарак (збожжавая, тэхнічныя культуры, жывёлагадоўля, рыбная лоўля, лес, паляваньне і г. д.), дык на 1 кастрычніка 1930 г. у калгасы было ўцягнута звыш аднэй пятай усіх сялянскіх гаспадарак (21,5 проц.). Звыш пяці мільёнаў сялянскіх гаспадарак адмовіліся ад індывідуальных форм гаспадаркі і перайшлі да калектыўных форм, пераканаўшыся на практыцы ў перавазе гэтых новых форм гаспадаркі. Калгасамі ў мінулым годзе засеяна **36 млн. гэктараў замест 20,6 млн. гэктараў, запраектаваных пяцігадовым пляном да канца пяцігодкі.** Жывёлагадоўчая праблема будзе вырашна на тыхжа шляхох, што і збожжавая праблема і прытым у найкаравейшы тэрмін. У росьце калгаснага будаўніцтва знайшла сваё бліскучае пацьвярджэньне правільнасьць тэй палітыкі, якую вёў і вядзе СССР у адносінах да сялянства.

Ліквідуючы кулацтва, як клясу, апіраючыся на калгаснікаў—гэту мацную апору савецкай улады на вёсцы, савецкая дзяржава цьвёрда і ўпэўнена вядзе індывідуальную бядняцка-серадняцкую гаспадарку да сацыялістычных форм зямляробства. І тут буйнейшую ролю адыгрывае правядзеньне павышэньня і рэканструкцыі тэхнічнай базы сельскае гаспадаркі. Кошт працуючых сельска-гаспадарчых машын узрос **з 1.400 млн. руб. да 1.700 млн.** рублёў. **Трактарны парк дасягнуў 1.022 тыс. конскіх сіл,** супроць **560 тыс. конскіх сіл,** вызначаных пяцігодкай. Бурны рост прамысловасьці і сельскае гаспадаркі прадзявіў і павышаныя патрабаваньні да работы транспарту і ў асабліваасьці чыгуначнага транспарту.

Паводле пяцігодкі чыгуначны транспарт павінен быў выканаць за два першыя гады пяцігодкі перавозку грузаў у разьмеры **350,9 млн. тон,** а фактычна аказаліся перавезенымі **409,2 млн. тон.** Пяцігодка аказалася перавыпаканай за два гады таксама і ў адносінах пасажырскага руху: паводле пяцігодкі меркавалася ажыцьцявіць **51,5 млрд. пасажыра-кілёмэтраў,** аказалася фактычна **77,1 мільярд.** Усе гэтыя буйнейшыя дасягненьні ў справе выкананьня заданьняў пяцігадоваага пляну, вызначаюцца рэзультатам валізарнейшай актыўнасьці і працоўнага энтузіязму ўсіх актыўнасьці і працоўнага энтузіязму ў ну найшырэйшых мас працоўных і, у першую чаргу, рабочае клясы, даваліліся зрабіць далейшы сур'ёзны крок у справе паляпшэньня матар'яльна-культурнага становішча

МЕСЯЧНІК ПРАВЕРКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ РАБОТЫ СЯРОД НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ

АДРАЗУ-Ж УЗЯЦЬ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

Рад партыйных арганізацый не разгарнулі масавай работы, не правялі папулярызацыі задач, якія стаяць перад месячнікам праверкі беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцяй. Неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі

„Месячнік праверкі становішча беларусізацыі і работы сярод нацменшасьцяй павінен згрупаваць увагу працоўных мас на неабходнасьці рашучага ўзмацненьня барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нац.-дэмакратызмам і яго агентурай у радах КП(б)Б—нацыянал-апартуністымі і шавіністымі інш. нацыянальнасьцяй".

(З пастановы ЦК КП(б)Б ад 21-XI—30 г.).

Дырэктывы засталіся на паперы

На заводзе «Дзеваапрацоўшчык» лічаць, што «кампанія» па праверцы беларусізацыі скончылася і больш нічога гаворыць аб ёй, бо ёсьць больш важныя пытаньні, якімі патрэбна займацца— так заяўляе культпрацаўнік заўкому тав. Кірыльчык. Месячнік па праверцы беларусізацыі, які быў праведзены Фрунзаўскім райкомам КП(б)Б, і тыя пастановы, якія былі адзначаны па заводзе «Дзеваапрацоўшчык» не знайшлі свайго праламленьня ў практычнай рабоце заводзкіх арганізацый. Ні адна арганізацыя заводу пальцам не даварушыла, каб што-небудзь зрабіць па выкананьні гэтых пастаноў. Камісіяй прапанавана арганізаваць гурток па вывучэньні беларускае мовы, больш выпісваць беларускіх газэт і т. д., але гэта запісана толькі на паперы. Гурток не працуе; гутаркі па беларускай мове — рэдкае зьяўленьне. Праўда, афіцыйныя паперы заводакіраўніцтва пішуцца на беларускай мове, апарат канторы і інш грамадзкіх арганізацый заводу не беларусізаваны. Калектыў камсамолу ня толькі не праводзіць ніякае работы па беларусізацыі камсамольскай арганізацыі, але нават ў плянe работ ня вызначыў для прапрацоўкі гэтае пытаньне.

На заводзе 75 проц. рабочых — беларусаў. У шмат якіх ёсьць жаданьне вывучаць беларускую мову, але кіраўніцтва заводу і заўком ня прымаюць ніякіх мер, каб стварыць адпаведныя мовы для вывучэньня беларускай мовы рабочымі заводу. Таксама не праводзіцца ніякае работы на роднай мове і абслугоўваньні рабочых іншых нацыянальнасьцяй.

Пастановы пленуму ЦК КП(б)Б па нацпытаньні не прапрацаваны як сярод партыйна-камсамольскіх мас, так сярод беспартыйных рабочых. Інтэрнацыянальнага выхаваньня сярод рабочых заўком не праводзіць.

У плянe заўкому прадугледжана правядзеньне двух інтэрнацыянальных вечароў, але-ж гэта толькі на форме, бо ў сутнасьці гэтыя пункты пляну з месяца ў месяц пераносяцца і не праводзяцца.

На заводзе назіраюцца асобныя акты шавіністычных выхадзак — выгляд антысэміцызму. Напрыклад, спраўдзілай работніцы — антысэміткі пераданы ў таварыскі суд і ўжо прайшло [illegible] часу, а справа не разглядаецца. Камандзір арганізацыі заводу таксама [illegible] ня прыцягнуў антысэміцкіх выхадзак рабочага Рымшы, які [illegible] антысэміцкіх подзіў. Бюро парткалектыву трэба зрабіць адпаведныя вынікі з становішча беларусізацыі на заводзе і навесьці нажную работу па інтэрнацыянальным выхаваньні, на найбольш шырокім ужываньні беларускай мовы ў штодзённай рабоце, рашуча змагаючыся з правамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, з правямі беларускага нацыянал-дэмакратызму, і іншымі шавінізмамі, а таксама з антысэмітызмам і прымірэнчымі да іх адносінамі.

КАЛЕНА.

Пакончыць з безадказнымі адносінамі да беларусізацыі

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Гаркомам партыі вылучана спэцыяльная камісія для праверкі становішча беларусізацыі на Гомельскім чыгуначным вузьле. Ужо першыя крокі праверкі беларусізацыі гавораць за тое, што партыйнае кіраўніцтва чыгункі праявіла «апартуністычныя адносіны да ажыцьцяўленьня нацыянальнай партыі. Яно не рэагавала на тыя супраціўленьні беларусізацыі, якія праяўляліся з боку асобных работнікаў чыгункі.

Вялікадзяржаўны шавінізм пусьціў свае моцныя карэньні нават і ў асобныя, менш устойлівыя, звеньні партыйнай арганізацыі. Беларусізацыя на чыгуначным вузьле амаль не праводзіцца. Напрыклад, уся перапіска ўнутранога характару па ўсіх грунах вядзецца на расійскай мове. Чым растлумачыць тое, што ў штодзённай рабоце ў гутарцы паміж сабой ні работнікі апарату, ні адміністрацыя беларускай мовы ня ўжываюць. Толькі адзінкі прабуюць гаварыць па-беларуску, але і яны ня маюць падтрыманьня з боку шырокіх мас супрацоўнікаў.

Праўда, адміністрацыяй «усё зроблена», яна выдала загад аб тым, каб уся перапіска вялася на беларускай мове, але гэта толькі загад. Фактычна ўсё засталося бяз усякіх зьмен.

Некаторыя партыйцы свой вялікадзяржаўны шавіністычны твар прыкрываюць нават «тэорыямі», што ў **нашых умовах немагчыма весьці перапіску на беларускай мове, бо ад гэтага здараюцца крушэньні цягнікоў.** За такімі, быццам, «рэвалюцыйнымі» фразамі хаваецца твар вялікадзяржаўных шавіністаў. Гэтым гаварачкам і тэорыям парт'ячэйка не дала належнага адпору.

Работнікі групы верхняга будаўніцтва пуці заяўляюць:

— Навошта нам вывучаць беларускую мову, калі нас могуць заўтра перакінуць на іншыя месцы, магчыма — у РСФСР.

Мы маем яўныя выступленьні вялікадзяржаўных шавіністых з такімі заявамі: — зноў узяліся за справу беларусізацыі. Трохі былі змоўклі. Непатрэбна ўводзіць гэтай незразумелай граматы.

А дырэктар станцыі тав. Вішнявецкі дагаварыўся да таго, **што беларусізацыяй займацца нельга,** бо першачарговая задача — гэта прамфінплян. Прапаведваньне гэтых тэорый альбываецца на вачох партыйных і прафсаюзных арганізацый чыгункі, і яны нічога ня робяць, каб мабілізаваць партыйныя масы на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, каб выкрыць да канца гэтыя тэорыі вялікадзяржаўных шавіністых, якія маскуюцца пад псэўдарэвалюцыйнай фразай.

Партыйцы-кіраўнікі, якія павінны былі паказаць прыклад усёй масе работнікаў, усяму парткалектыву, яны замест гэтага заяўляюць:

— Паколькі я панаў у асяроддзьдзе, дзе не гавораць на беларускай мове, дык я сам выступаю па расійскай мове.

Адказны сакратар вучкпрафсачу—тав. Салапаў заканчіўся яшчэ далей.

— Я ня ведаю беларускай мовы таму, што хтосьці разлагае беларусізацыю.

І па гэтай безадказнай заяве ніхто ня ўдарыў, ніхто ня даў бальшавіцкага адпору.

За тое, што на чыгунцы змазалі пытаньне беларусізацыі, гаворань факты «очковтирательства» з боку асобных адказных работнікаў вучкпрафсачу. На прыклад, старшыня вучкпрасфачу—тав. Міхайлаў на пасяджэньні камісіі па правеньні беларусізацыі даваў хлусьлівыя весткі аб тых ці іншых работніках, як добра валодаючых беларускую мову. Фактычна-ж аказалася, што яны ня толькі ня ведаюць беларускай мовы, а нават ня хочуць яе вывучаць і ўжываць. Па ўсім чыгуначным вузьле сярод партыйцаў-кіраўнікоў выпісваецца толькі 3 экз. «Зьвязды».

Нацкамісія за праяўленьне апартуністычных адносін да правядзеньня нацпалітыкі пастанавіла прыцягнуць да партыйнай адказнасьці нач. раёну — Досычава і рад іншых адказных працаўнікоў чыгуначнага вузла.

Нацкамісіяй вызначаны канчатковыя тэрміны для вывучэньня беларускай мовы і зроблена катэгарычнае патрэбаваньне, што ў выпадку нявывучэньня беларускай мовы яны будуць зьнімацца з работы. Запрапанавана вучкпрафсачу разгарнуць шырокую работу па інтэрнацыянальным выхаваньні рабочых, і па абслугоўваньні рабочых нацменшасьцяй на роднай мове.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што партыйнае кіраўніцтва чыгункі недаацаніла палітычнага значэньня беларусізацыі, не паставіла ў цэнтры увагі барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як з галоўнай небясьпекай, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі іншых колераў, а таксама і з прымірэнцкімі да іх адносінамі.

Гарком КП(б)Б павінен прыняць усе меры да таго, каб зрабіць рашучы пералом у адносінах беларусізацыі на чыгуначным вузьле. Трэба да канца выкрыць контр-рэвалюцыйную сутнасьць розных шавінізмаў. Сканцэнтраваць удар на вялікадзяржаўным шавінізьме, як галоўнай небясьпецы, узмацняючы і надалей барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў. Партыйнае кіраўніцтва чыгункі павінна прыняць усе захады да таго, каб растлумачыць шырокім масам рабочых пастановы партыйных арганізацый, мабілізаваўшы іх на рашучае ажыцьцяўленьне нацпалітыкі партыі.

Мацней ударыць па вялікадзяржаўных шавіністых

Папяровае аб'яднаньне пры ВСНГБ (Менск) да гэтага часу зусім нават ня ўжывае беларускай мовы. Толькі ў кастрычніку месяцы гэтым пытаньнем стала займацца партыйная ячэйка і мясцком.

Спэцыяльная камісія выявіла, што папяровае аб'яднаньне хварэе вялікадзяржаўным шавінізмам. Гэта хвароба цэнтральнай рэспубліканскай установы заражае ўсе падлеглыя ёй ніжэйшыя ўстановы. Вядомая справа, калі каля 50 чалавек працуе ў гэтай установе, а ўжывае беларускую мову процантаў 10-15, то нізавыя звеньні гэтай установы і гэтага ня маюць.

Вось факты.

У кастрычніку месяцы камісія сумесна з парт'ячэйкай і мясцкомам на агульных сходах ставілі пытаньне аб беларусізацыі. На сходы прыходзіла ня больш 20-25 проц. супрацоўнікаў. Былі выпадкі, калі прыходзіла 3-5 чалавек. Гэтыя ўсобы імкнуліся аганьбіць беларускую мову, як нікому непатрэбную.

Інжынэр **Шапіра** на адкрытым сходзе служачых папяровага аб'яднаньня на запытаньне камісіі, чаму ён ня ўжывае белмовы, адказвае:

— Белмову я пя ўжываю, па-першае, таму, што працую ў папяровым аб'яднаньні ўсяго 2 з лішнім гады і, падругое, я лічу, што гэта не замежная мова, а крышку, ну, як вам сказаць, грубаватая мова, а па-трэцяе, што гэту мову ніхто не разумее. Мне вельмі многа даводзіцца пісаць здымкаў, якія патрэбна пасылаць у Маскву. Там натуральна гэткай грубай хамскай мовы не разумеюць. Мне зусім непатрэбна ваша беларуская мова. Няхай яе вучаць вашы дзеці.

Другі выпадак. Інжынэр **Розэнфэльд** працуе ўжо даўно ў ВСНГ. Ён так тлумачыць сваё нежаданьне вывучыць беларускую мову:

— У мяне па-беларуску выходзіць так груба і нелёгчна, як і мова беларуская грубая і нелёгчная.

Калі яго пачалі сароміць, дык ён кажа:

— Я зусім не намеран быць тут у Беларусі. Я мяркую паехаць у Харкаў і хутчэй мне патрэбна вучыць украінскую мову, чымся беларускую. Вы на мяне, дружочкі, не пасядайце, будзе не карысна вам мяне навучыць гэтай ломаной мове.

Такіх Розэнфэльдаў і Шапіраў у гэтай установе яшчэ вельмі шмат знойдзецца. Яны зрываюць усю справу беларусізацыі.

Гурток па беларусізацыі пры папераб'яднаньні амаль ніхто не наведвае. Розэнфэльдаўшчына і Шапіраўшчына глыбока ўкараніліся ў асяродзішча служачых гэтага наркамату.

Партыйная ячэйка і мясцком павінны рашуча і бязьлітасна змагацца з правямі і канкрэтнымі посьбітамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, а таксама: з беларускім нац. дэмакратызмам.

В. ЖУКАЎ.

Партсетцы---беларускія падручнікі

Большасьць партыйных школ Кастрычніцкага раёну Менску працуе на расійскай мове. Замест таго, каб у першапачатковых партшколах як у раёне, так і на прадпрыемствах навесьці вучобу на беларускай мове, не фармальна, а па сутнасьці, райком закупіў для школ падручнікі выключна на расійскай мове. Аб гэтым частка слухачоў выказвала думку, што **«лепш мець падручнікі на расійскай мове, бо на ёй лягчэй займацца». З боку прапагандыстых і часткі саміх слухачоў быў дан адпор гэтым ноткам вялікадзяржаўнага шавінізму.**

Райком і загадчыкі партшкол ня ўжылі ніякіх мер да таго, каб закупіць падручнікі на беларускай мове і поўнасьцю забясьпечыць імі ўсе партыйныя школы.

Гэтыя факты датычаць ня толькі Кастрычніцкага РК, але і большасьці партыйных ячэек і рэёнаў, якія таксама не забясьпечылі партшколы літаратурай на беларускай мове.

КАЗЛОЎ.

У баку ад нацпалітыкі

На шпалернай фабрыцы імя Вароўскага становішча беларусізацыі—катастрафічнае. Парткалектыў фабрыкі фактычна стаяў у баку ад той барацьбы, якую праводзіць партыя з ухіламі ў нацыянальным пытаньні. Пастаноў апошняга пленуму ЦК КП(б)Б па нацпытаньні парткалектыў не прапрацаваў. Замест таго, каб стаць на чале барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як з галоўнай небясьпекай, кіраўніцтва парткалектыву не мабілізавала мас на барацьбу з ім. Больш таго, у складзе бюро парткалектыву ёсьць яўны вялікадзяржаўны шавіністы — **Багдановіч, які рашуча выступае супроць тых, хто вывучае і ўжывае беларускую мову.**

Камісія Фрунзаўскага РК КП(б)Б па праверцы беларусізацыі канстатавала амаль поўную адсутнасьць на фабрыцы работы ў гэтым напрамку. Здавалася-б, што гэта павінна было-б стаць сыгналам да мабілізацыі калектыву на барацьбу за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі партыі, за ўзмацненьне работы па інтэрнацыянальным выхаваньні. Аднак, бюро парткалектыву абмежавалася толькі тым што вынесла пастанову згадзіцца з вывадамі камісіі і ня прыняла ніякіх мер для іх ажыцьцяўленьня.

Работа сярод нацменшасьцяй зусім не вялася і гэта ў той час, калі на фабрыцы нацыянальны склад рабочых вельмі рознастайны. Работа парткалектыву і фракцыі фабкому вядзецца на расійскай мове. Камуністыя беларускай мовы ня ўжываюць. На фабрыцы ёсьць асобныя выпадкі нацыянальна-варожых настрояў, якія не заўсёды атрымліваюць належны адпор

За апошні час наглядаецца некаторы зрух у справе праяўленьня нацпалітыкі партыі. Бюро парткалектыву на апошнім пасяджэньні вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў па правядзеньні месячніка праверкі беларусізацыі. Бюро парткалектыву павінна прыняць рашучыя захады да ліквідацыі прарыву, які наглядаецца ў справе ажыцьцяўленьня нацпалітыкі. Трэба рашуча ўжываць пастановы апошняга пленуму ЦК КП(б)Б аб несумяшчальнасьці прапаганды нацыянал-апартуністычных поглядаў з прыналежнасьцю да КП(б)Б. Трэба рашуча выкінуць з партыйных радоў тых, хто перашкаджае правядзеньню нацыянальнай палітыкі партыі.

Стрыжакоў.

Разгортваем вакол месячніка масавую работу

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Бюро Бабруйскага райкому партыі пастанавіла правесьці з 1 сьнежня па 1 студзеня па ўсім раёне месячнік праверкі становішча беларусізацыі і абслугоўваньня працоўных нацменшасьцяй.

Пры райкоме складзен штаб па правядзеньні і кіраўніцтве месячнікам. Парт'ячэйкам і парткалектывам прапанавана скласьці пры сабе спэцыяльныя камісіі па правядзеньні месячніка на мясцох. Рэдакцыі газэты «Камуніст» і радыё-газэце прапанавана абгаварыць пытаньне аб месячніку на сходах рабкораў і радыёкораў, арганізаваць брыгады для праверкі ходу месячніка.

На прадпрыемствах будзе праведзена адпаведная растлумачальная работа. На жактах будуць праведзены сходы жанчын з мэтай растлумачэньня сутнасьці пастаноў Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б і задач месячніка. Праведзена будзе праверка вынікаў работы па інтэрнацыяналізацыі прадпрыемстваў.

А. Магідаў.

Пралетарская дыктатура зломан чэ адзін фронт контр-рэвалюцыі ў складзе буржуазна-інтэлігенцкай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў, былых белых міністраў так званай «БНР». Горнутае сацыялістычнае наступленьне бязьлітасна зьнішчала і будзе зьнішчыць у сваім пераможным руху ўсякае праціўленьне клясавага ворага, у ім-б вопратцы гэты вораг не апранаў: якімі-б фразамі ён не маскаваў сваёй работы.

Пры дапамозе і актыўным удзеле шырокіх працоўных мас БССР, дзякуючы вялікай нацыянальнай палітыцы (б)Б і яе ЦК, дзякуючы рашучаму і шырокаму змаганьню з усімі нацыяналізмамі, верным вартавым пралетарскай дыктатуры — ДПУ — раскрыта контр-рэвалюцыйная і падрыўная работа нацдэмаўскай групы і чорная здрадлівая дзейнасьць іх выведзена на чыстую воду.

Яны—гэтыя прэтэндэнты на кар. рабочае клясы і сялянства Савецкай Беларусі, гэтыя кандыдаты на «міністэрскія» пасты акупаванай Беларусі, і марылі аб крывавым зьнішчэньні пралетарскай дыктатуры? Перад намі праходзяць «знакомые всё лица». Прахо-дзь цэлая пляяда «прожженных» контр-рэвалюцыянэраў, вопытных палітых прастытутак і прадаўпчыкоў рэсаў беларускіх працоўных нямецкім генштабам і контр-разьведкам буржуазных дзяржаў. Усе гэтыя Ластоўскі, Лёсікі, Некрашэвічы, Цьвікевічы і падобныя панове маюць «багатае» контр-рэвалюцыйнае мінулае, поўнае гвардзейскіх «учынкаў» і пахаваньняў у барацьбе супроць Савецкай Беларусі. Будучы міністрамі апэратачнага ўрадаў «БНР», яны з вялікарнай ганасьцю прымалі ўдзел у вайне супроць рэвалюцыі. За грошы імпэрыялістаў яны прадавалі гуртам і ўраздроб беларускі народ, які, ня пытаючыся ва ўсяго гэтага нацыяналістычнага збродду, ішоў пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і ў саюзе з усімі працоўнымі б. царскай Расіі за свабодную, самастойную Сацыялістычную Савецкую Беларусь, супроць імпэрыялістаў і іх верных саюзьнікаў—беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Прыкрываючы свой контр-рэвалюцыйны твар маскай «барацьбітоў за Беларусь», Лёсікі і Ластоўскія, Некрашэвічы, Цьвікевічы і К° актыўна змагаліся супроць Савецкай Беларусі, **супроць** працоўных мас Беларусі

Шукаючы ідэялёгамі беларускай буржуазіі, гэтыя былыя міністры ў сваёй контр-рэвалюцыйнай работы ў мінулым і ў цяперашнім ня мелі ніякай апоры ў масах нашай краіны. Гэтыя і іх цяперашняе — гэта ланцуговаяньняў перад капіталістычнымі сіламі, гэта — выпрошваньне ў іх дапамогі для барацьбы супроць савецкай улады, пры адступнасьці сувязі з масамі.

Буржуазны друк, і асабліва фашысцкі і нацыянал-фашысцкі друк Польшчы і Зах. Беларусі, шалее з поваду выкрытай ДПУ групы контр-рэвалюцыйных нацдэмаў. У сваёй клясавай злосьці супроць краіны Саветаў, у шалёнай кампаніі паклёпаў, якую гэта прэса вядзе ў цяперашні момант, кампаніі, зусім відавочна падначаленай ваенным плянам польскага імпэрыялізму, вораг з-за кардону будзе цалыя «нязьлічоныя полчышчы», што ўстаюць па закліку арыштаваных контр-рэвалюцыйных інтэлігентаў. Нам няма патрэбы абвяргаць гэтыя брэдні ворага, настолькі відавочна іх глупства і хлусьлівасьць. Групка контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў круцілася ў вузкім і даволі замкнутым коле **верхавін** беларускай інтэлігенцыі. Каставы характар гэтае групы выступае з такой-жа яркасьцю, з такой-жа відавочнасьцю, як выступіла ў часе працэсу «прампартыі» каставасьць іізаляванасьць ад мас гэтай шкодніцкай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі.

Марачы аб зьвяржэньні ненавісны ім пралетарскай дыктатуры, беларускія нацыянал-дэмакраты сустракалі і сустракаюць жорсткі адпор шырокіх працоўных мас БССР і мэлянхалічна вымушаны прызнаваць у сваіх - жа ўласных паказаньнях, што **мас яны за сабой ня мелі.** Лёсік адзін з правадыроў групы, проста гаворыць у сваіх паказаньнях:

«Мы ведалі, што сіл у нас няма і аб узброеным паўстаньні супроць савецкай улады думаць ня прыходзіцца»...

З патасам дэклямуючы аб «народзе», аб сваёй «мэсыяністычнай» ролі ў справе адраджэньня Беларусі, яны на справе з панска-памешчыцкай пагардай, з кулацкай нянавісьцю адносіліся да працоўных мас беларускага сялянства.

Вось што гаворыць той-жа Лёсік:

«Мы больш разьлічвалі на беларускую буржуазію, а на сялянства глядзелі, як на сырую этнаграфічную масу, якая павінна найсьці за сваёй інтэлігенцыяй...»

І калі гэта «сырая этнаграфічная маса» ў асобе бядняцка-серадняцкага сялянства павярнула пад кіраўніцтвам нашай партыі ў бок да сацыялізму, калі яна на базе суцэльнай калектывізацыі пачала ажыцьцяўляць ліквідацыю кулацтва, як клясы, — беларускія **нацыянал - дэмакраты** завылі ў шалёнай злосьці прышчэмленых сабак, яшчэ больш жорстка аказваючы супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню.

Будучы адарванай ад мас, група контр-рэвалюцыйнай нацыяналістычнай інтэлігенцыі — Лёсікі, Ластоўскія і К° —выходзілі ў сваёй падрыўной, антысавецкай рабоце **з надзей на вайну, на хуткую інтэрвэнцыю.** І, вядома, яны ня толькі жывіліся **марамі і надзеямі,** яны **актыўна, скарыстоўваючы ўсе магчымасьці, усе свае сілы, імкнуліся падрыхтаваць спрыяючую глебу для гэтай інтэрвэнцыі і паскорыць яе. У вайне супроць БССР,** вайне польская імпэрыялізму, яны бачылі рэалізацыю сваёй клясавай **буржуазна-кулацкай прагармы,** сваіх крывавых фашысцкіх плянаў.

Па сваёй сутнасьці, па характары ўсёй іх работы, па іх праграмных дэкларацыях і практычнай рабоце яны былі **беларускай агентурай польскага імпэрыялізму, беларускай агентурай інтэрвэнтаў, працуючы ў цесным кантакце з зах.-беларускім нацыянал-фашызмам.**

Беларускія нацыянал-дэмакраты былі злучаны як палітычныма, так і арганізацыйнымі сувязямі з інтэрвэнтамі і іх вернымі саюзьнікамі — беларускімі нацыянал - фашыстымі з Заходняй Беларусі. Яны выконвалі па сутнасьці работу агентаў польскага генштабу, **вядучы знутры падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць БССР.** Таксама як і іх украінскія прыяцелі Яфрэмаў і К°, таксама як і іх прыяцелі з «прампартыі», таксама як і Кандрацьцеў, Громан і Чаянаў, — яны ставілі сваёй задачай садзейнічаць ажыцьцяўленьню плянаў інтэрвэнцыі, актыўна прымаць у ёй удзел і актыўна рыхтаваць яе.

Возьмем усю іх падрыўную шкодніцкую контр-рэвалюцыйную работу—з чаго выходзіла яна? Імкнучыся да ўзмацненьня сіл капіталізму ў краіне (прыпэпаўшчына ў Наркамземе, палітыка Баліцкага ў Наркамасьветы, пераўтварэньне Акадэміі Навук у месца аборышча контр-рэвалюцыйнага збродду, усемагчымыя «навукова-дасьледчыя» камісіі, прыкрываўшыя контр-рэвалюцыйную работу і г. д., і г. д.), уся гэта **работа нацдэмаў** па сутнасьці мела мэтай падрыхтаваць спрыяючыя ўмовы для зьвяржэньня пралетарскай дыктатуры шляхам узброенай інэрвэнцыі, якая-б магла абапёрціся на кулацка-нацдэмаўскія элемэнты ўнутры БССР.

Верная служба ўсёй гэтай контр-рэвалюцыйнай і прадажніцкай сволачы інтэрвэнтам у цяперашні пэрыяд зьяўляецца **працягам** іх службы інтэрвэнтам у мінулым. Арыентацыя на польскі імпэрыялізм, якая характарызуе іх контр-рэвалюцыйную работу на даным этапе, мела сваё месца ў яўна выяўленай форме і ў 1919-20 г. г., калі польскі імпэрыялізм ішоў на Савецкую краіну і акупаваў значную частку Савецкай Беларусі.

Ня шкодзіць імённа зараз успомніць гэта мінулае беларускай контр-рэвалюцыі і падаць сякія-такія гістарычныя дакументы, якія, да рэчы сказаць, праліваюць сьвятло і на ўсе гэтыя фігуры «ідэёвых нацыянальных дзеячоў», якія па сутнасьці зьяўляюцца высока-кваліфікаванымі здрадлікамі і заўсядальнікамі габінэтаў польскай дэфэнзывы.

У канцы 1919 году, у часе польскай акупацыі, у Менск прыяжджала дэлегацыя польскага сойму, якая ўключала ў сваім складзе прадстаўнікоў усіх буржуазных і згодніцкіх партый Польшчы. На адным з пасяджэньняў з прывітальным словам па адрасе гэтай дэлегацыі выступіў ня хто іншы, як Лёсік. Контр-рэвалюцыйная беларуская газэтка, якая выдавалася тады ў Менску пад назвай «Звон», так паведамляла аб гэтай прамове Лёсіка.

«Прывітаў ён польскае войска, каторая вызваліла край ад Маскоўскага наезду, зазначыў далейшую лучнасьць Белай Русі з Польшчай, каторая не загасла...» *)

Лёсік у 1919 годзе «вітаў» армію імпэрыялістычнай Польшчы. Ён старанна рыхтаваўся да такіх-жа прывітаньняў і ў новых умовах сучаснага пэрыяду.

Калі крыху пазьней акупаваны Менск быў наведан дыктатарам Польшчы Пілсудскім, гэта-ж беларуская газэта, захлынаючыся ад захапленьня, вітала галоўнага з акупантаў.

«Прывет табе, начальнік польскай дзяржавы, на тваёй родная зямельцы—Беларусі»—так пісала газэта.

Разважаючы на тэму аб службе Пілсудскаму, гэта-ж газэта пісала.

«Нам здаецца, што надыходзіць разьвязуючы момант. Пілсудскі — на Беларусі... Сьвядомыя гэтай павагі, мы разам з усімі радасна вітаем нашага вялікага зямляка у сэрцы зямлі беларускай, прастарым Менску. Мы хочам верыць, што ён, гэты рыцар з Захаду, не па тое заваладаў сэрцам Беларусі, каб яе скрыўдзіць, але каб падняць з заняпаду зачараваную княжну ў сялянскіх шатах, каб вяруць ёй адвечны пасад яе, каб памагчы ўтварэньню незалежнай і непадзельнай Беларусі...»

Беларускія нацыянал-дэмакраты з раскрытымі абдымкамі прымалі акупантаў, якія агнём і мячом распраўляліся з працоўнымі масамі Беларусі, палілі яе вёскі, мястэчкі і гарады, расстрэльвалі дзесяткі і сотні рабочых і сялян, ператвараючы краіну ў акупаваную калёнію польскага капіталу. Імённа так павінна была выглядаць «незалежнасьць» Беларусі ў прадстаўленьні гэтых халуёў польскага імпэрыялізму, гэтых агентаў польскай дэфэнзывы, гэтых арганізатараў і натхняцеляў балаховіцкіх банд.

Трэба, да рэчы, адзначыць, што ў тым-жа нумары «Звону», які мы вышэй цытавалі, дзе з такім патасам шчаняты беларускай контр-рэвалюцыі віталі свайго пана, зьмясьціў свой верш і Янка Купала пад назвай «Паўстань». Мы лічым патрэбным і магчымым напомніць аб гэтым гістарычным факце («з песьні слова ня выкінеш») таму, што шырокія масы БССР у праве патрабаваць ад народнага паэты ясных адказаў на пытаньні **—з кім ён зараз.** Працоўныя масы БССР у праве патрабаваць ад Купалы такога-ж яснага адказу, які яны пачулі гістарычны дням ад Якуба Коласа, які заўляе аб сваім рашучым разрыве з беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

Але, магчыма, ўсё тое, што мы тут падавалі з мінулага, гэта **толькі гісторыя? Не! Мы вярнуліся да мінулага для таго, каб кожнаму працоўнаму стала ясна ЦЯПЕРАШНЯЕ беларускай контр-рэвалюцыі.**

Той-жа Лёсік, які ў 1919 г. «радасна вітаў» акупантаў, гаворыць у сваіх **апошніх паказаньнях:**

«Нашы надзеі для зьвяржэньня савецкай улады мы ўскладалі на вайну з Польшчай, інтэрвэнцыю...»

Як бачым, зусім яснае прызнаньне аб тым, што ўсе іх надзеі выходзілі з інтэрвэнцыі.

«Усе мы — гаворыць Лёсік,—ня верылі ў цьвёрдасьць і пастаянства савецкага ладу. Калі савецкая сыстэма не праваліцца сама сабой ад эканамічнай разрухі, **дык гэта зробіць інтэрвэнцыя,** бо поўнадежна існаваць дзьве сыстэмы—капіталістычная і сацыялістычная—на могуць».

Выходзячы з гэтых пэрспэктыў, беларускія нацыянал-дэмакраты ўзмоцнена рыхтаваліся да гэтай інтэрвэнцыі, узмоцнена імкнуліся падрыхтаваць глебу для антысавецкай вайны імпэрыялістычнай Польшчы. Лёсік адкрыта прызнаецца, што

«...Мне здавалася, што граніць Польшчу, гэта значыць падрубіць той сук, на якім вісеў наш ідэал самастойнай Беларусі»...

Такім чынам, арыентацыя на польскі імпэрыялізм з усёй выразнасьцю выказана ў словах аднаго з кіраўнікоў арыштаванай групы. Зьвязваньне з лёсам польскага імпэрыялізму лёсаў будучым, што нацыянал-дэмакраты ўзмоцнена працавалі ў гэтым напрамку—да ператварэньня Сав. Беларусі накшталт Зах. Беларусі ў простую калёнію польскага капіталу.

Шляхам інтэрвэнцыі яны імкнуліся зьнішчыць уладу рабочых і сялян. Шляхам інтэрвэнцыі яны хацелі зьнішчыць усе завяваньні ў галіне будаўніцтва Савецкай Беларусі, як непадзельнай часткі ўсяго Савецкага Саюзу. **зьнішчыць усе завяваньні ў галіне будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры.** Паглядзеце, што робіцца зараз у Заходняй Беларусі пры актыўным удзеле Лупкевічаў, Астроўскіх, Станкевічаў і інш., і вы ярка прадставіце сабе тое, што рыхтавалі беларускія нацыянал-дэмакраты тут у БССР. **што і** як спадзяваліся яны ажыцьцявіць рукамі інтэрвэнтаў і іх саюзьніка—беларускай контр-рэвалюцыі.

Працас «прампартыі», які адбываецца ў Маскве, раскрывае крок за крокам тайнікі падрыхтоўчых работ да ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР. Для беларускія нацыянал-дэмакраты ў **саюзе з вялікадзяржаўнай расійскай буржуазіяй,** у саюзе з усімі гэтымі Рамзінамі, Лукомскімі і Рабушынскімі, пад камандай польскіх і французскіх інтэрвэнтаў, таксама, як у свой час разам з Даянікіным і французскімі акупантамі, рыхтавалі задушэньне савецкай улады і фізычнае зьнішчэньне рабочае клясы і рэвалюцыйнага сялянства.

Контр-рэвалюцыйная работа групы нацыянал-дэмакратаў раскрыта. Але ня зьнята ўзрастаючая небясьпека інтэрвэнцыі, ня зьнята і небясьпека нацыянал-дэмакратызму.

Шырокія працоўныя масы БССР гнеў на выказваюць свой пратэст супроць здрадніцкай работы нацдэмаўскіх агентаў польскага імпэрыялізму, рыхтаваўшых вайну супроць БССР. Працоўныя патрабуюць суровага пакаранья контр-рэвалюцыянэраў.

Клясавая пільнасьць павінна быць яшчэ больш абвострана і павялічана. Яшчэ актыўней трэба працаваць над умацаваньнем абароназдольнасьці Савецкай краіны. Усе сілы працоўных— на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на выкананьне ўсіх плянаў ударнага кварталу. Поныя прылівам рабочых у рады партыі, шырокім разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва, бальшавіцкім правядзеньнем перавыбарчай кампаніі—масы аказалі і будуць аказваць на «прорыск» інтэрвэнтаў і іх агентаў. Яшчэ больш актыўна трэба змагацца з пралуёўнымі усіх нацыяналізмаў, **з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе,** з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, польскім і яўрэйскім шавінізмамі. Трэба бязьлітасна біць па тых, хто хоча аслабіць змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе. Вялікадзяржаўныя шавіністы, як гэта мы ня раз бачылі па радзе яркіх прыкладаў, у чульлівым саюзе з беларускімі нацыянал-дэмакратамі выступалі і выступаюць супроць пралетарскай дыктатуры, супроць нацпалітыкі нашай партыі. Непрымірымым агнём па агентах беларускага нацыянал-дэмакратызму ўнутры партыі — нацыянал-апартуністых, па ўхіле да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, і яго канкрэтных посьбітах, па нацыянал-ухілістах усіх масьцей; актыўным выкананьнем усіх пастаноў апошняга пленуму ЦК па нацыянальнай палітыцы; яшчэ большай актывізацыяй змаганьня за беларусізацыю, за аўладаньне пралетарскім кіраўніцтвам нацыянальна-культурнага будаўніцтва—адказваюць і будуць адказваць на работу контр-рэвалюцыянэраў нашы партыйныя арганізацыі.

Мізэрная група нацдэмаўскіх інтэлігентаў выкінута на сьмецьнік. Па ўсіх іх спробах сарваць сацыялістычнае будаўніцтва БССР, павярнуць назад маховае кола гісторыі нанесен магутным кулаком пралетарскай дыктатуры рушыўчы ўдар. Савецкая Беларусь пры вялізарнейшым уздыме і энтузіязьме мільённых мас, перамагаючы і ламаючы супраціўленьне класавага ворага, пад цьвёрдым і выпрабаваным кіраўніцтвам КП(б)В і яе ЦК будуе сацыялізм. Калі міжнародныя і польскія імпэрыялістыя ў саюзе з унутранай контр-рэвалюцыяй будуць прабаваць сарваць шляхам інтэрвэнцыі нашу мірную працу, зны сустрэнуць жалезную сьцяну шматмільённай Чырвонай арміі зьнішчальны адпор усяе савецкае краіны.

А. Альшэўскі

Беларуская агентура інтэрвэнтаў

*)

Актыўным ўдзелам у перавыбарах саветаў—адказам інтэрвэнтам!

За баявы штаб апэрацыйнага кіраўніцтва!

3 сьнежня адбылося чарговае паседжаньне цэнтральнай выбарчай камісіі. Пасьля заслуханьня даклады асобных членаў і арганізацый, як яны падрыхтаваліся да перавыбарчай кампаніі.

ЦП рабземпесу правяло даволі значную работу па падрыхтоўцы сельгасрабочых і батракоў да актыўнага ўдзелу ў перавыбарах саветаў. Праведзены рэшныя нарады рабачкомаў, арганізаваны брыгады для дапамогі сельсветам, вылучаных 250 батракоў і сельгасрабочых у якасьці работнікаў сельсаветаў. Гэта значна палепшыць склад сельсаветаў.

Аднак, ініцыятыва саюзу, каб пратусьціць вылучаных праз кароткатэрміновыя курсы, ня была своячасова рэалізавана ЦКСБ і цэнтральнай выбарчай камісіяй. Гэтыя органы ня ўлілі паміж сабою пераговоры аб арганізацыі курсоў, такуль не наблізіўся час перавыбараў сельсаветаў, калі пытаньне ўжо само па сабе адпала.

Цэнтральная выбарчая камісія ўхваліла работу саюзу Рабземлес, асабліва яго ініцыятыву па вылучэньні 250 рабочых і прапанавала ЦК выпрацаваць заказ для вылучаных на работу ў сельсаветах.

* * *

Даклад ЦК ЛКСМБ поўнасьцю паўтарэдзіў вынікі райду брыгады «Праўды» і «Зьвязды», што асьветлены нумары «Зьвязды» ад 2 сьнежня. ЦК ЛКСМБ, як і мясцовыя камсамольскія арганізацыі, надавычай слаба ўдзельнічаў дагэтуль ва ўсёй падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў. Дадатным фактам зьяўляецца вылучэньне 300 лепшых камсамольцаў вясковых і мехцэхавых ячэек на работу ў якасьці сакратароў сельсаветаў. ЦК ЛКСМБ у апошнія дні пастанавіў мабілізаваць 130 камсамольцаў - актывістых на дапамогу сельскім саветам у правядзеньні перавыбарчай кампаніі. ЦК камсамолу неабходна зараз - жа заняцца праверкай работы ўсіх зьвяленьняў камсамольскай арганізацыі, прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў кампаніі групы «лёгкай кавалерыі», арганізаваць пракурачныя брыгады—па - баявому разгарнуць работу па ўключэньні камсамолу ў перавыбарчую кампанію.

* * *

Як рыхтуюцца асобныя наркаматы да перавыбараў саветаў?

Наркамасьветы выдаў брашуру з інструкцыйна - мэтадычнымі паказаньнямі аб формах удзелу культасьветных устаноў у перавыбарах. Але, ня гледзячы на тое, што з 1 сьнежня ўжо праходзяць перавыбары сельсаветаў, брашура знаходзіцца покуль што ў Менску... Ці нельга НКАсьветы пасьпяшаць з пасылкай брашуры, каб месцы атрымалі яе да, а не пасьля перавыбараў?

Даклад Наркамасьветы зьняты ў другі раз з парадку дня цэнтральнай выбарчай камісіі з прычыны ня ўкі яго прадстаўніка на пасяджэньні.

НК Аховы Здароўя даў дырэктыўныя паказаньні ўсёй сеткі лекара-санітарных устаноў. На зьезьдзе Ахматкладу, які зараз адбываецца, стаіць агульнае пытаньне аб удзеле ўстаноў НК Аховы Здароўя ў перавыбарчай кампаніі.

Пракуратура рэспублікі пасылае 10 пракураў у раёны, дзе работа пастаўлена нездавальняюча.

Усё-ж трэба адзначыць, што ў цэнтральных установах работа па перавыбарах, як наложыць, яшчэ не разгарнулася.

Далей было заслухана пытаньне аб забесьпячэньні работнікаў, якія накіроўваюцца на стацыю работу ў вёску.

Цэнтральная выбарчая камісія паставіла ўнесьці ў прэзыдыум ЦВК БССР прапанову, каб гэтую групу работнікаў прыраўняць да вылучэнцаў. Камісія таксама пастанавіла арганізаваць для гэтых таварышоў кароткатэрміновыя курсы.

У гэтым годзе, апрача групы работнікаў, якія едуць на сталую работу ў вёску, для дапамогі перавыбарам саветаў выяжджае шмат іншых работнікаў. Прафсаюзы Беларусі пасылаюць 300 рабочых з прамысловых цэнтраў; ЦК ЛКСМБ — 130 камсамольцаў; Магілеўскі палітэхнікум — 160 студэнтаў; менскі гарсавет—50 членаў гарсавету, факультэт права БДУ — 25 студэнтаў. Перад цэнтральнай выбарчай камісіяй стаіць задача найбольш правільна скарыстаць па раёнах таварышоў, якія выяжджаюць у вёску.

* * *

Прыходзіцца яшчэ раз адзначыць, што, ня гледзячы на пачатак выбараў сельсаветаў, у рабоце цэнтральнай выбарчай камісіі ўсё яшчэ не адчуваецца баявых тэмпаў. Напрыклад, дагэтуль цэнтральная камісія не змагла дабіцца ад раёнаў вестак аб складзе раённых і сельскіх выбарчых камісій. Цэнтральная камісія дагэтуль не разгледзела і не зацьвердзіла складу раённых камісій, а гэта значыць, што камісія ня ведае, наколькі клясавы склад раённых і сельскіх камісій адпавядае патрабаваньням інструкцыі па перавыбарах.

На пасяджэньні цэнтральнай выбарчай камісіі, як і дагэтуль, зьяўляюцца далёка ня ўсе члены камісіі. Некаторыя наркаматы і цэнтральныя ўстановы ігнаруюць выклікі іх на пасяджэньні (Наркамасьветы, Калгасцэнтр, саюз Працаўсьветы і інш.); гэта гаворыць аб апартуністычнай недацэнцы перавыбараў.

Цэнтральная выбарчая камісія павінна працаваць больш інтэнсыўна, хутчэй разгледзець і зацьвердзіць склад раённых і сельскіх выбарчых камісій, заслухаць даклады асобных раённых выбарчых камісій (з папярэднім абсьледаваньнем), дабіцца, каб разгарнулі работу цэнтральныя ўстановы, прасачыць, каб у бліжэйшыя-ж дні была разаслана ўся літаратура і інш. матар'ялы да перавыбараў саветаў.

Павінны быць прыняты ўсе меры да таго, каб цэнтральная выбарчая камісія стала сапраўдным баявым штабам, які здолеў-бы ажыцьцяўляць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва важнейшай палітычнай кампаніі — перавыбараў саветаў.

М. З.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі ператворым сельсаветы ў сапраўдных арганізатараў калгаснага прыліву

ШЫРЭЙ УЦЯГВАЮЧЫ КАЛГАСЬНІКАЎ У ПЕРАВЫБАРЫ, НЕ ЗАБЫВАЦЬ АДЗІНААСОБНІКАЎ

Паасобныя цэнтральныя і мясцовыя ўстановы дапускаюць апартуністычную недаацэнку гэтай важнейшай палітычнай кампаніі

Праз 5 дзён пачынаюцца перавыбары

Калгассыстэма прымае слабы ўдзел у падрыхтоўцы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). 10-га сьнежня па ўсіх сельсаветах раёну пачнецца справаздачна-перавыбарчая кампанія.

У большасьці сельсаветаў падрыхтоўка да перавыбараў праведзена добра. Наладжаны сходы бедноты, жанчын, моладзі, падрыхтаваны кандыдатуры, разасланы абіральныя позвы.

Слаба праведзена падрыхтоўка ў Мышкаўскім і Кавалеўскім сельсаветах. Калгасная сыстэма прымае невыстарчальны ўдзел у падрыхтоўцы да перавыбараў. У некаторых мясцох яшчэ не разгорнута работа в беднатой.

Для ўцягваньня ў кампанію нацменшасьцяй у раёне арганізаваны два польскія, адзін яўрэйскі і некалькі расійскіх выбарчых вучасткаў.

Падрыхтоўка шырока ўвязваецца са сканчэньнем гаспадарчых кампаній на вёсцы і арганізацыяй новага прыліву ў калгасы.

А. Магістраў.

Адтэрмінавалі з-за дрэннай падрыхтоўкі

25 лістапада пленум Смаляві́цкага РВК з удзелам усіх старшынь сельсаветаў пастанавіў адтэрмінаваць пачатак перавыбараў сельсаветаў да 10 сьнежня; між тым, кампанію трэба было пачаць з 1-га.

Чым выклікана гэта пастанова?

Раённыя арганізацыі дагэтуль дрэнна падрыхтаваліся да перавыбараў. Па 7 сельсаветах яшчэ ня складзены сьпісы выбаршчыкаў і асоб, пазбаўленых выбарчых праў. Сельсаветы не правялі сходаў беднаты, жанчын і моладзі.

26 лістапада адбылося першае пасяджэньне раённай выбарчай камісіі. Да гэтага часу камісія нічога не рабіла. Прафсаюзы і грамадзкія арганізацыі так сама не падрыхтаваліся да кампаніі.

29 лістапада праведзена пры райкоме нарада ўпаўнаважаных на перавыбарах, а 30 упаўнаважаных выехалі на месцы. Са спазьненьнем пачаў райком праводзіць масавую работу. Толькі зараз склі́каецца раённы зьлёт рабселькораў, груп «лёгкай кавалерыі», на 7 сьнежня прызначана канфэрэнцыя батрацка-бядняцкіх і калгасных груп.

Раённыя арганізацыі недаацанілі палітычнага значэньня кампаніі і праявілі недапушчальную павольнасьць у падрыхтоўцы.

Р. Хадыка.

Перавыбары--на рэйкі сацспаборніцтва

Віцебск прыняў выклік Менску

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Віцебская гарадзкая выбарчая камісія прыняла выклік Менскай гарадзкой камісіі на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. У оваю чаргу віцебская камісія выклікала на сацспаборніцтва Гомельскую.

Праз друк будзе праведзена пераклічка прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый у мэтах мабілізацыі рабочых мас вакол кампаніі.

Для пасьпяховага правядзеньня падрыхтоўкі члены гарадзкой выбарчай камісіі прымацаваны да паасобных прадпрыемстваў.

Выправіць на-ходу

Некаторыя ячэйкі КП(б)Б Клічаўскай раённай партарганізацыі недаацанілі палітычнай важнасьці справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў. Ня гледзячы на тое, што дырэктыва з боку РК аб разгортваньні шырокай работы па падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў была дана яшчэ ў кастрычніку, паасобныя парт'ячэйкі на працягу першых двух дэкад лістапада не правялі належнай актыўнасьці ў справе мабілізацыі саўгасных рабочых, калгасьнікаў, беднаты і серадняковай - адзіноасобнікаў, на забесьпячэньне пасьпяховага правядзеньня перавыбарчай кампаніі і рашучага адпору клясаваму ворагу. Мала што зроблена за перыяд падрыхтоўчай работы таксама і з арганізацыйна-тэхнічнага боку (устанаўленьне перавыбарчых пушткаў, забесьпячэньне іх адпаведнымі памяшканьнямі, пасылка абястак і г. д.).

Найбольшай нядбайнасьцю ў падрыхтоўчай рабоце адзначылася клічаўская калгасная парт'ячэйка, якая амаль нічога не рабіла да пачатку справаздачна- перавыбарчай кампаніі сельсаветаў. Ячэйка нават ня вывучила і не абмеркавала на сходах калгасьнікаў і беднаты кандыдатур у новы склад сельсавету. У выніку такой бязьдзейнасьці гэта ячэйка засталася ў баку ад узрастаючай актыўнасьці асноўных бядняцка - серадняцкіх мас у сувязі з перавыбарамі саветаў, страціла сваю кіруючую ролю ў гэтым пытаньні. Клічаўскі дэлегацкі пункт высунуў ад сябе кандыдатуры бяз ведама і ўдзелу ячэйкі.

Апартуністычную бязьдзейнасьць паасобных ячэек імкнуцца выкарыстаць кулацкія элементы, якія актыўна дзейнічаюць у напрамку зрыву мерапрыемстваў партыі па ўзмацненьні нізавых органаў пралетарскай дыктатуры — сельскіх саветаў.

Падагуліўшы папярэднія вынікі падрыхтоўчай работы да справаздачна-перавыбарчай кампаніі, клічаўскі райком КП(б)Б завастрыў увагу раённай парт-арганізацыі на задачах неадкладнай ліквідацыі дапушчаных прарываў у рабоце паасобных ячэек.

Для ўзмацненьня работы па перавыбарах саветаў, райком дадатковa камандыраваў на месцы работнікаў з раённага актыву.

Ун.

Чырвоная армія—у перавыбарах

Ва ўсіх часьцях Чырвонай арміі пачалася падрыхтоўчая работа да перавыбараў саветаў.

Прыступілі да складаньня сьпісаў на чырвонаармейцаў, начсклад і іх сем'і. Распрацаваны пляны па-зашкольнай работы. Часьці зьвязаліся з гарадзкімі выбарчымі камісіямі.

Яшчэ адстае ў гэтай рабоце нізавы чырвонаармейскі друк — «Ільлічоўкі» і нізавыя шматтыражкі.

У часьцях мяркуецца правядзеньне растлумачальных гутарак і спэцыяльных палітычных заняткаў аб задачах перавыбараў саветаў. Члены гарадзкіх саветаў у часьцях будуць рабіць справаздачы перад сваімі выбаршчыкамі.

Вялікае значэньне мае ўдзел Чырвонай арміі ў перавыбарах на вёсцы і таму чырвонаармейцы-ўдарнікі будуць складаць і пасылаць калектыўныя лісты ў свае сельсаветы і калгасы з парадамі даць і пасылаць калектыўныя лісты ў свае сельсаветы і калгасы з парадамі аб лепшым правядзеньні кампаніі па перавыбарах саветаў.

НЕКАТОРЫЯ ЧАСЬЦІ АРГАНІЗУЮЦЬ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІЯ БРЫГАДЫ ДЛЯ ПРАВЕРКІ ВАЙСКОВАЙ РАБОТЫ Ў ПАДШЭФНЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ І ГАДАДЗКІХ САВЕТАХ, ДЗЕ ЗНАХОДЗІЦЦА ВАЙСКОВАЯ ЧАСЬЦЬ.

Паміж часьцямі РСЧА будуць заключаны сацыялістычныя дагаворы на лепшую падрыхтоўку да кампаніі па перавыбарах саветаў, на пагалоўную яўку на справаздачныя і перавыбарчыя сходы, на актыўны ўдзел у складаньні наказу для будучага савету.

В.

Нагнаць упушчаны час

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Падрыхтоўка да перавыбараў сельсаветаў па Магілеўскім раёне разгорнута вельмі слаба. Да гэтага часу толькі 7 сельсаветаў раёну прадставілі весткі аб ходзе падрыхтоўкі. Рэшта раёнаў маўчыць.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі ў большасьці сельсаветаў не займаліся пытаньнямі перавыбараў, ня сталі на чале кіраўніцтва гэтай важнейшай палітычнай кампаніяй.

Чырвонапольскі сельсавет толькі тыдзень назад склаў выбарчую камісію. Сьпісы выбаршчыкаў, а таксама асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, да гэта часу ня складзены. Актыў сельсавету не мабілізован вакол справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Між тым, кампанія паводле пляну, павінна быць пачата 9 сьнежня.

Напярэдадні выбараў у Менгарсавет

— Менская гарадзкая выбарчая камісія канстатавала зусім нездавальняючае становішча са складаньнем сьпісаў выбаршчыкаў. З 2.000 устаноў і прадпрыемстваў Менску сьпісы выбаршчыкаў падалі толькі 30, ня гледзячы на тое, што апошні тэрмін падачы — 25 лістапада — ужо прайшоў.

Камісія пастанавіла прасіць ЦСПСБ даць дырэктывы аб паскарэньні складаньня сьпісаў.

— Белдзяржкіно рыхтуе да справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету спэцыяльную часопісь, у якой будуць адлюстраваны дасягненьні і недахопы ў рабоце Менгарсавету

— Выбарчая камісія выклікала на сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне перавыбарчай кампаніі Гомельскі і Віцебскі гарсаветы. Сакратарыяту камісіі даручана распрацаваць канкрэтныя пункты сацдагавору.

— Камісія пастанавіла паслаць у Самахвалавіцкі, Астрашыцка-Гарадзецкі і Заслаўскі раёны 50 рабочых менскіх прадпрыемстваў для дапамогі мясцовым арганізацыям у правядзеньні перавыбараў сельсаветаў.

Горацкі гарсавет ня справіўся з работай

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад аб рабоце Горацкага гарсавету. Прэзыдыум адзначыў, што гарсавет ня здолеў перабудаваць сваёй работы ў адпаведнасьці з пераходам на раённую сыстэму кіраўніцтва. Гарсавет невыстарчальна кіраваў гарадзкімі ўстановамі і арганізацыямі. Сэкцыі гарсавету працавалі слаба.

Прэзыдыум ЦВК БССР прызнаў работу Горацкага гарсавету НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ.

Нацыянальны яўрэйскі савет у м. Кублічах

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанавіў арганізаваць у м-ку КУБЛІЧАХ (Вушацкі раён) нацыянальны яўрэйскі савет. Агульная колькасьць насельніцтва Кубліцкага нацыянальнага савету—784 чал., з якіх яўрэяў — 70,7 проц.

Лёзунгі да перавыбараў саветаў

1. Узмацнім абароназдольнасьць краіны Саветаў. Дамо рашучы адпор міжнародным інтэрвэнтам.
2. Выкананьне бягучых гаспадарча-палітычных кампаній узмацніць абароназдольнасьць БССР і наносіць рашучы ўдар па шкодніках.
3. Няхай жыве савецкая палітыка міру. Прэч правакатараў вайны і арганізатараў эканамічнай блёкады СССР.
4. Няхай жыве Чырвоная армія—апора мірнай палітыкі Саветаў, верны вартаўнік сацыялістычнага будаўніцтва і межаў БССР.
5. Прымежнасьць БССР з капіталістычнымі краінамі патрабуе пільнасьці рабочае клясы да абароны.
6. БССР была, ёсьць і будзе верным фарпостам Савецкага Саюзу на рубяжы з капіталістычным Захадам.
7. Толькі савецкая ўлада можа выратаваць сьвет ад войн і крывяпраліцьцяў.

Няхай жыве Савецкая Ўлада ва ўсім сьвеце.

8. Інтэрнацыянальнае зьяднаньне працоўных мас—сіла, аб якую разаб'ецца фронт сусьветнай рэакцыі. Няхай жыве адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцяй.
9. Няхай жыве беларуская пралетарская культура—нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьмесьце. Вышэй тэмпы беларусізацыі.
10. За цьвёрдае і пасьлядоўнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Накіруем агонь на вялікадзяржаўным расійскім шавінізьме — галоўнай небясьпецы, па контр-рэалізацыйным беларускім нацыянал - дэмакратызьме, які садзейнічае інтэрвэнтам, і па шавіністых іншых нацыянальнасьцяй.

11. Скарыстаем справаздачна-перавыбарчую кампанію для большага ўцягненьня ў сацыялістычнае будаўніцтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй.
12. Працоўныя — шчыльней рады навокал КП(б)Б. Пад кіраўніцтвам партыі па-бальшавіцку правядзем перавыбары саветаў.
13. У час перавыбараў узмацнім рабочымі, батракамі, беднатой і калгасьнікамі органы пралетарскай дыктатуры—саветы. Высунем на работу ў саветы— адданых змагароў сацыялістычнага фронту рабочых-ударнікаў.
14. Саветы, сэкцыі, дэпутацкіх групы на прадпрыемствах — арганізатары сац. спаборніцтва, ударніцтва і актыўныя ўдзельнікі ў выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.
15. Перабудуем работу сельсаветаў і ператворым іх у сапраўдных арганізатараў і кіраўнікоў калектыўнага руху.
16. Ачысьцім саветы ад бюракратаў, валакітчыкаў, шкоднікаў сацыялістычнага будаўніцтва, ад кулацка-нэпманскіх абаронцаў і іх прыхільнікаў.
17. Узмацніўшы сувязь рабочае клясы з працоўным сялянствам—замацуем пралетарскі ўплыў на праву саветаў.
18. Саветы павінны стаць сапраўднымі арганізатарамі мас па пераманьні труднасьцяй сацыялістычнага росту.
19. Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі набліжае перамогу сацыялізму. Выканаем пяцігодку за чатыры гады.
20. Гарсаветы—на перадавыя пазыцыі барацьбы за паляпшэньне рабочага забесьпячэньня, за арганізацыю новага быту і культурнага адпачынку рабочых.
21. Бязьлітасна змагаючыся з бюракратызмам, аздаровім работу саветаў і наблізім іх да працоўных мас.
22. Перавыбары саветаў павінны яшчэ больш замацаваць дыктатуру пралетарыяту і ўзьняць на вышэйшую ступень дзейнасьць саветаў і іх сэкцый.
23. Забясьпечым у працы саветаў правядзеньне выразнай клясавай пралетарскай лініі.
24. Шырока разгорнем крытыку і самакрытыку ў справаздачна - перавыбарчай кампаніі саветаў. Возьмем пад агонь пралетарскай самакрытыкі работу саветаў.
25. Працоўныя жанчыны! Усе на актыўны ўдзел у перавыбарах саветаў!
26. Камсамольцы! шчыльней згуртуйце свае рады вакол КП(б)Б. Няхай жыве камсамол—актыўны памочнік партыі і баявы змагар за саветы, за суцэльную калектывізацыю.
27. Узмацнім барацьбу з цякучасьцю рабочае сілы, будзем змагацца супроць пятуноў—дэзарганізатараў вытворчага фронту.
28. Пад кіраўніцтвам кампартыі накіруем энэргію і актыўнасьць рабочае клясы і асноўных мас сялянства на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.
29. Батрацтва, беднота, калгасьнікі—апора савецкае ўлады і застрэльшчыкі калектывізацыі ў вёсцы.
30. Разгорнем работу па суцэльнай калектывізацыі і на гэтай аснове ліквідуем кулацтва як клясу.
31. Праводзячы сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, мацней ударым па кулаку ў вёсцы і нэпману ў горадзе.
32. Уперад за бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва сацыялістычнай індустрыі, за разьвіцьцё саўгасаў і калгасаў.
33. Няхай жыве культурная рэвалюцыя ў сацыялістычнай краіне. Працоўныя! на барацьбу за няўхільнае ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня.
34. Няхай жыве УсеКП(б)Б—арганізатар і правадыр пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі.
35. Правы апартунізм—галоўная небясьпека на даным этапе. Ачысьцім рады партыі ад агентуры клясавага ворага—правых апартуністых.
36. Прэч з радоў бальшавіцкай партыі двурушнікаў-апартуністых, здраднікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі.
37. Прэч дэзарганізатараў сацыялістычнага наступленьня—правых і «левых» апартуністых.
38. За сталёвае адзінства партыі на аснове ленінізму, за разгорнутае бальшавіцкае наступленьне па ўсім фронце.
39. Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, яе Цэнтральнага Камітэту, уперад да новых перамог. Вышэй сьцяг УсеКП(б)—арганізатара Кастрычніцкай рэвалюцыі.

ЦК КП(б)Б.

Зводка барацьбы за прамфінплян

Засталося 25 дзён

Прамысловасьць БССР і ў лістападзе мае рад прарываў

ГАСПАДАРЧЫЯ І ПРАФСАЮЗНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ НЕАДКЛАДНА РАСПРАЦАВАЦЬ РАД МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ

Папярэднія даныя аб выкананьні беларускай прамысловасьцю лістападаўскай праграмы гавораць аб тым, што прамысловасьць працавала нездавальняюча.

ШВЭЙНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ за 25 дзён лістапада выканала праграму ўсяго на 86,8 проц. Асабліва адстаюць: віцебская фабрыка «Прафінтэрн»—77 проц., магілеўская фабрыка імя Валадарскага—74,9 проц. і бабруйская фабрыка імя Дзяржынскага—79,1 проц.

ЗАПАЛКАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ выканала праграму ў лістападзе НА 84 ПРОЦ. Адстаюць: рэчыцкая фабрыка «Дняпро»—71 проц., барысаўская фабрыка «Пралетарская перамога»—79 проц., рэчыцкая фабрыка «Х Кастрычнік»—91,7 проц., гомельская фабрыка «Вэзувій»—92 проц. і «Чырвоная Бярэзіна»—92,5 проц.

ГАРБАРНА-АБУТКОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ поўных вестак не дала. У ЦСНГ ёсьць толькі весткі па трох прадпрыемствах. Віцебская гарбарня за 25 дзён выканала праграму на 81,6 проц., віцебская абутковая фабрыка за 20 дзён—на 80 проц., менская абутковая фабрыка за лістапад—на 94 проц.

ПАПЯРОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ за 25 дзён выканала праграму прыблізна НА 80 ПРОЦ.: «Гэрой працы»—на 78, «Спартак»—на 77, «Чырвоная зорка»—на 79, «Прафінтэрн»—на 79, кардонная фабрыка імя Леніна—на 67, кардонная фабрыка імя Вароўскага—на 75 проц.

Аб МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ў ВСНГ таксама амаль няма ніякіх вестак. Вядома, што толькі іголачная фабрыка ў Віцебску выканала праграму ў лістападзе на 84 проц., «Ударнік»—на 60 проц., Гомсельмаш—на 32,8 проц. (замест 990 сіласарэзак завод выпусьціў 325 сіласарэзак).

Асноўныя прычыны слабай работы прамысловасьці, як і раней, хаваюцца ў АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ НЕЛАДОХ. Калі адкінуць мэталёвую і гарбарную прамысловасьць, у якіх былі некаторыя затрудненьні з сырцом, дык ва ўсіх іншых галінах прамысловасьці прарывы тлумачацца ЎНУТРАНЫМІ НЯЎВЯЗКАМІ, ДРЭННЫМ ТЭХНІЧНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ і г. д. Найбольш яркі прыклад—фабрыка «Гэрой працы». Там усё ёсьць—і сырэц, і рабочая сіла, і патрэбная колькасьць кіраўнікоў. А тэхнічныя прастоі і брак цягнуць фабрыку да чорнай дошкі.

Гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі павінны прыпажыць ўсе сілы, мабілізаваць усю рабочую масу і дабіцца ў СЬНЕЖНІ поўнай ліквідацыі прарываў першых двух месяцаў ударнага кварталу.

Падцягнуць гузікавы цэх

Фабрыка «Беларуска» ў кастрычніку выканала праграму на 118,2 проц., у лістападзе—на 116,3 проц. Прадукцыйнасьць працы вырасла ў кастрычніку на 18 проц., у лістападзе—на 12 проц.

Але ў сувязі з сырцовымі затрудненьнямі, цэх па выробе гузікаў у кастрычніку выканаў праграму на 72,4 проц., а ў лістападзе—на 68,5 проц. Частка рабочых гэтага цэху ў сувязі з недагрузкай была перакінута ў цэх па выробе грэбянёц. Належная колькасьць сырцу для грэбневага цэху (дзякуючы сацдагавору паміж фабрыкай і ленінградзкім заводам, які забясьпечвае яе сырцом) дала магчымасьць грэбанёваму цэху выканаць у кастрычніку праграму на 153,1 проц., а ў лістападзе—на 152,1 проц. Такім чынам, перавыкананьне праграмы ў аднам, перавыкананьне праграмы ў другім цэху.

Але невыкананьне праграмы па выробе гузікаў можа выклікаць некаторыя перабоі ў рабоце швэйнай прарыя перабоі. Таму адміністрацыі «Беларускі» трэба напружыць усе сілы, каб падцягнуць цэх, які выробляе гузікі.

Забясьпечыць Крычаўскі цэмэнтны завод рабочай сілай

КРЫЧАЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД БРЫГАДЫ «ЗЬВЯЗДЫ»). РАБОЧЫМІ КІРАЎНІЦТВА ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ ПРАВЕДЗЕНА ДВУХТЫДНЕВІК ПРАЦЫ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ. ПОЎНУЮ МАГЧЫМАСЬЦЬ ПРЫСТУПІЦЬ ДА МАНТАЖНЫХ ПРАР'ЯЛАМІ БУДАЎНІЦТВА ЗАБЕЗПЕЧАНА ПАСЬЛЯ ПРАВЕРКІ ЯНОЎЛЕНА НАЯЎНАСЬЦЬ ЧЫМАСЬЦЯЙ СКОНЧЫЛІСЬ ЖАЛЕЗА-БЭТОННЫЯ ЗАЛІВКІ І КЛАДКУ ДЭГЛЫ, УКЛЮЧАЮЧЫ ЛІНІСТРАЦЭНТРАЛЬ, У ДЗЕ СЯЦІДЗЕННЫ ТЭРМІН. ДЛЯ ГЭТАГА ПАТРЭБНА НА 10 ДЗЁН 200 ЧОРНАРАБОЧЫХ І 160 КАМЕНІЧЫКАЎ. ОРГАНЫ ПРАЦЫ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ. МІЖ ТЫМ СПРЫЯЮЧАЕ НАДВОР'Е ПРАХОДЗІЦЬ.

ПАВЯРНЕЦЕ НАРКАМПРАЦЫ ТВАРАМ ДА ЦЭМЭНТУ.

СЕЛЬБУДАБ'ЯДНАНЬНЕ—ВАСЭРМАН.

ЦВ БУДАЎНІКОЎ—ЗЛОТНІКАЎ, БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ»—ВЕРЖБАЛОВІЧ.

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ

РАШАЮЧЫЯ 6 ДЗЁН

ПОЎНАЙ ПЕРАМОГАЙ НА ЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ ЎЗМОЦНІМ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ КРАІНЫ

Зломім супраціўленьне кулацтва і яго агентуры—правых апартуністых

За апошні час нагнялаецца значнае паніжэньне тэмпаў збожжазагатовак.

Аб гэтым гаворыць параўнаньне ходу збожжазагатовак за пятую і шостую пяціднёўкі лістапада. За пятую пяціднёўку лістапада месячны плян быў выкананы на 7 проц. Шостая пяціднёўка дае значнае паніжэньне—толькі 5,9 проц. пляну.

Усяго на 1 сьнежня загатоўлена 94.393 тоны, што складае 68,4 проц. заданьня.

Асабліва дрэнна ідуць збожжазагатоўкі па лініі саўгасаў. Гадавы плян на 1 сьнежня выканан на 25,7 проц.

Невыкананьне пляну саўгасамі нельга нічым іншым тлумачыць, як апартуністычнымі адносінамі да загатовак: «саўгаснае збожжа ад нас не ўцячэ».

Калгасны сэктар выканаў плян на 52,4 проц. Райкалгассаюзы і РВК спыніліся ўсякую сыстэматычную работу ў адносінах збожжазагатовак па калгасах.

Упередзе ідзе індывідуальны сэктар. Гадавы плян выканан ім на 84,1 проц.

Недапушчальна павольна спаганяецца закантрактаванае збожжа. Усяго спагнана спачатку году 39,5 проц. закантрактаванага збожжа.

Ёсьць і такія факты, калі кантрактацыйныя дагаворы нават не афармлены. Вось, напрыклад, Бабруйскае раённае спажывецкае таварыства ня ведае, з кога спаганяць закантрактаваную прадукцыю. У дакладной запісцы бабруйскае раённае спажыв. таварыства паведамляе Белкаапсаюзу:

«Пры правядзеньні загатовак высьветлілася, што большая частка гаспадарак, якія па сьпісах райпаляродсаюзу лічацца калтрактантамі, катэгарычна адмовіліся ад гэтага, матывуючы тым, што аб гэтым яны чуюць упершыню».

Паводле вестак б. акрпаляводсаюзу, па Бабруйскім раёне закантрактавана 1.595 тон. Райвыканком лічыць, што ўсяго закантрактаванага збожжа ёсьць 680 тон. Далейшая праверка выявіла, што і райвыканкомаўскія лічбы не адпавядаюць сапраўднасьці.

Адной з асноўных прычын дрэннага тэмпу загатовак зьяўляецца тое, што нашы загатоўшчыкі і раёны ня здолелі зьвязаць збожжазагатоўкі з іншымі відамі загатовак. Некаторыя раёны праявілі агідную апартуністычную бязьдзейнасьць. Чырвона-Слабодзкі раён гадавы плян выканаў на 35 проц., Самахвалавіцкі — на 35,6 проц., Стара-Дарожскі — на 42,8 проц., Глускі—на 46,1 проц., Чачэвіцкі — 44,8 проц. Ошвіслацкі — на 49,8 проц., Клімавіцкі—на 48,8 проц. Капаткевіцкі—на 52,5 проц., Клікаўскі—на 53,3 проц., Капыльскі—на 54,9 проц., Любаньскі—на 51,6 проц., Крычаўскі—на 57,7 проц. і г. д.

Праваапартуністычная практыка асабліва яскрава праяўляецца ў адносінах да спагнаньня збожжа па цьвёрдых заданьнях з кулацкіх гаспадарак у няўжываньні ніякіх рэпрэсыўных мер да кулацкага сабатажу.

Рагачоўскі, Церахаўскі і Расонскі раёны яшчэ да гэтга часу не паведамілі Наркамгандлю аб разьмеры цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам. Аршанскі, Хойніцкі, Магілеўскі, Нараўлянскі, раёны прыслалі Наркамгандлю весткі аб колькасьці агульнага заданьня кулацка - заможным гаспадаркам, але чамусьці, ня гледзячы на неадназовыя прапановы з боку Наркамгандлю, не прысылаюць вестак аб ходзе спагнаньня.

Спагнаньне з кулацка-заможных гаспадарак ідзе надавычай дрэнна, хоць усе тэрміны, вызначаныя ЦК КП(б)Б і СНК, даўно ўжо прайшлі.

Азарыцкі раён павінен быў спагнаць на цьвёрдых заданьнях 170 тон, спагнана-ж на 1-га сьнежня толькі 0,4 тоны. Койданаўскі раён, замест 391 тоны спагнаў 19 тон. Глускі замест 234 тон, 50 тон.

На правых апартуністых, якія зрываюць выкананьне загатовак, трэба рашуча, бязлітасна ўдарыць. «Мяккія» адносіны да кулацкага сабатажу нельга інакш расцэньваць, як дапамогу клясаваму ворагу.

Да 10 сьнежня плян загатовак павінен быць выканан.

Чырвонымі абозамі б'ем па плянах інтэрвэнтаў

ЕЛЬСК, (Наш кар.) Весткі аб выкрыцьці контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай арганізацыі і аб судзе над «прампартыяй» выклікалі вялікую хвалю абурэньня бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

30-га лістапада ў мястэчка прыбыў вялікі чырвоны абоз з 100 фурманак са збожжам, ільном, бульбай і гародніной.

На кожнай фурманцы--плякаты і сьцягі з надпісамі: «За масавы прыліў у калгасы»; «Наш адказ шкодніцкам, інтэрвэнтам і контр-рэвалюцыянэрам —беларускім нац.-дэмакратам — поўнае выкананьне пляну загатовак»; «Усе лішкі—дзяржаве»; «У бой за клясава-вытрыманыя і працаздольныя с'льсаветы».

Калгас «Чырвоны Ельск» на сваім плякаце рапартаваў, што ён здае дзяржаве ў якасьці адказу інтэрвэнтам 6 тон збожжа, 816 кгр. ільну-валакна, 640 кгр. ільну-семя, 100 цэнтн. бульбы, 310 цэнтн. гародніны і 12 цэнтн. тутуню.

*Чырвоны абоз зьявіўся моцнай дэманстрацыяй згуртаванасьці мас калгасьнікаў, беднякоў і серадня

Збор лому—важнейшае мерапрыемства па мабілізацыі рэсурса

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ МАРТЭНЫ СЫРЦОМ

ПА-БАЯВОМУ ПРАВЯДЗЕМ ДЭКАДУ ЗБОРУ ЛОМУ

Зьбіраць адкіды мэталю!

Ад дэкады—да арганізацыі сталага збору мэталялому

На працягу ўдарнага кварталу мы адчуваем вострую нястачу мэталю, якая часамі адбіваецца на нармальнай рабоце нашых заводаў.

Гэта гаворыць аб тым, што пытаньне збору лому на кожным прадпрыемстве, у кожным цэху павінна займаць зараз ня меншае месца, чым іншыя вытворчыя пытаньні. Між тым, большасьць дырэктараў нашых заводаў ня могуць сказаць, што яны адносяцца да збору лому з патрэбнай увагай.

Атрыманыя ў вытворчасьці адкіды мэталю павінны сыстэматычна вывучацца заводзкімі бюро рацыяналізацыі з пункту гледжаньня магчымасьці скарыстаньня іх (адкідаў) для іншых дэталяй машын на тым-жа заводзе, або на іншых заводах. Для гэтага кожны дырэктар павінен мець у сябе разьмеры усіх жалезных і сталёвых паўфабрыкатаў, патрэбных беларускім заводам. Напрыклад, завод «А» на ножніцах рэжа з круглага жалеза валікі даўжынёю ў 500 мм, дыямэтрам у 45 мм, прычым пасьля разрэзкі застаецца адрэзак даўжынёю ў 450 мм, гэтаму заводу непатрэбны, але затое ён можа быць скарыстан на заводзе «Б», якому патрэбны валікі дыямэтрам у 45 мм і даўжынёю ў 420 мм.

Кіруючыся табліцамі, складзенымі на падставе гэтых вестак, сартыроўчыя павінен зьбіраць, сартаваць і складаць усе адкіды на поўным месцы па гатунках і разьмерах у тры групы: адкіды, якія можна скарыстаць на сваім заводзе, адкіды для іншых заводаў і адкіды, якія паляжаць здачы Рудмэталягандлю для адгрузкі мэталюргічным заводам.

Кожны завод павінен старацца адгружаць гэтыя адкіды ў відзе гатовага паўфабрыкату, калі гэта дазваляюць яму яго вытворчыя магчымасьці. Стружкі жалеза і сталі трэба зьбіраць у скрынкі і ні ў якім разе не хаваць іх на заводзе больш тыдню, бо пры доўгім знаходжаньні на адкрытым паветры яны разьядаюцца іржою і ператвараюцца ў мэталічны пыл.

Чыгунныя стружкі могуць выкарыстоўвацца на сваім-жа заводзе. Спосаб іх выкарыстаньня зусім звычайны і не выклікае ніякіх выдаткаў апалу. Заключаецца ён у тым, што па сканчэньні плаўкі чыгуну ў вагранцы стружкі кідаюцца ў вагранку і ад жару, які ішчэ ёсьць у печцы, яны расплаўляюцца і адліваюцца ў чушкі, якія потым скарыстоўваюцца для чыгуначнай аллічкі.

Усе гэтыя мерапрыемствы пры належнай увазе да іх з боку адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый заводу, пры правільным іх ажыцьцяўленьні павінны адыграць значную ролю ў справе эканоміі мэталю і паляпшэньні работы нашых мэталюргічных заводаў.

Інжынэр ФІШ.

На ідэалёгічным фронце

Супроць апартунізму і прымірэнцтва!

Пры катэдры марксізму-ленінізму ВАН створана брыгада па праверцы часопісі «Наш Край», для выкрыцьця ў гэтай часопісі варожай нам буржуазнай нацдэмакратычнай і валікадаяржаўнашавіністычнай ідэалёгіі.

Часопісь «Наш Край» зьяўляецца «Kredo» нацдэмакратыяму. Там сканцэнтравана ўся найбольш яркая, адкрытая, махрова-контр-рэвалюцыйная праграма нацдэмакратызму, знайшоў свае выяўленьне стык валікадаяржаўнага шавінізму і нацыянал-дэмакратызму, там мы бачым найбольш наглае выступленьне клясавага ворага. Мы ня знойдзем за ўсе 6 год выданьня часопісі (25—30 г. г.) ні аднаго артыкулу аб КП(б)Б аб СССР; больш таго—на працягу ўсіх 59 нумароў ні слова ні ў адным артыкуле мы ня знойдзем аб дапамозе БССР з боку СССР, аб кіраўнічай ролі КП(б)Б, аб ролі пралетарыяту і г. д., але мы на кожнай старонцы сустрэнем надобнае:

«З прычыны таго, што Невельскі павет знаходзіцца ў складзе РСФСР, дык русіфікацыі Невельскага павету праз школы праводзіцца ў значна большых разьмерах, чымся пры цары».

(В. Шавельскі. «Н. К.» № 11(38) за 28 г.).

— «Масква, што дошка — стаіць шырока і ўсюды цісьне».

(«Н. К.» № 1 за 27 г., стар. 27).

Выступленьне супроць дыктатуры пралетарыяту гістарычна абгрунтоўваецца тым, што раваліцыя 17 г. падаецца як «магутная аграрная рэвалюцыя».

(Гарэцкі. Юбілейны нумар «Н. К.», прысьвечаны 10-цігодзьдзю Кастрычніка).

Адмяжоўваючыся ад «Усходу», Н. К.» апіраецца ўплыў «Захаду»:

— «Ужо самае знаходжаньне Беларусі ў беспасрэднай бліскасьці ад Заходняй Эўропы не магло не адбіцца на культурнасьці беларусаў і разам з тым на дзіцячай сьмяротнасьці».

(Нарэш. «Н. К.» № 2-3 за 26 г. стар. 31).

Ужо гэтая невялічкая колькасьць прыкладаў, лік якіх можна павялічыць, яскрава сьведчыць аб кірунку часопісі «Н. К.» і аб тым, якая цільная і жорсткая барацьба патрэбна з такой выразна контр-рэвалюцыйнай канцэпцыяй.

У спрэчках па дакладзе аб «Нац-дэмакратычных тэорыях у гістарычнай прадукцыі «Н. К.» (27-XI) некаторыя з выступаючых т. т., удзельнікаў брыгады, у тым ліку і камуністы, у сваіх выступленьнях праводзілі права-апартуністычныя погляды, груба скажаючы лінію партыі ў пытаньнях барацьбы з рэакцыйнай ідэалёгіяй наогул, нац-дэмакратызмам і валікадзяржаўным шавінізмам у прыватнасьці.

Дакладчык, выкрываючы нац-дэмакратычныя канцэпцыі і рэакцыйна-буржуазную мэтадалёгію ў гістарычнай прадукцыі «Н. К.», зьвярнуў увагу і на тое, як маладыя навуковыя працаўнікі падпадалі пад уплыў варожай нам ідэалёгіі і праводзілі яе ў сваіх артыкулах у «Н. К.» і ў спрэчках, замест таго, каб выкрываць свае рэакцыйна-мэтадалёгічныя і нац-дэмакратычныя па сутнасьці памылкі, яны замазвалі іх, аслабляючы гэтым барацьбу з нац-дэмакратызмам.

Тав. т. БАБРОВІЧ бачыць памылку выключна ў першай частцы зьмешчанага ў «Н. К.» свайго артыкулу «м. Койданава», якую зьвёў да таго, што ён дае шмат месца старажытнасьці.

Тав. Шпілеўскі, які разам з тав. Бабровічам пісаў артыкул, прысутнічаў на сходзе, але ня выступіў, чым палкам салідарызаваўся з тав. Бабровічам.

Тав. МАЦВЕЕНАК замест таго, каб сканцэнтраваць агонь па нац-дэмакратычнай канцэпцыі «Н. К.» і па вышэй паказаных памылках маладых працаўнікоў, стаў абурана папракаць дакладчыка ў тым, што дакладчык не заўважыў нічога карыснага ў «Н. К.», а заяўся вышукваньнем і крытыкай нацдэмаўскіх установак, у прыватнасьці ў тав. Бабровіча і Шпілеўскага.

Тав. Аляксандраў, «навукова» абгрунтоўваючы валікадзяржаўны шавінізм — як тэзіс, нац-дэмакратызм — як антытэзіс і нац-апартунізм—як сынтэз, такім вульгарным і сваволным трактаваньнем трыяды, фактычна змазвае клясавую сутнасьць нац-дэмакратызму. Ён убачыў карэньні памылак т. т. Бабровіча, Шпілеўскага, Самцэвіча і інш. маладых у тым, што яны прадстаўлялі сабе краязнаўства, як самамэту. Тым самым тав. Аляксандраў змазвае буржуазную сутнасьць іх мэтадалёгіі, якая зьяўляецца вынікам уплыву на іх ідэалёгіі буржуазных гісторыкаў (Нічэта, Друшчыц, Жарынаў і інш.).

Шмат памылак было дапушчана ў спрэчках і іншымі выступаючымі т. т.

Усе вышэйпамянёныя таварышы зьяўляцца членамі брыгады па праверцы «Н. К.», а ў сваіх выступленьнях змазвалі барацьбу з нац-дэмакратызмам, аслабляючы сілу ўдара па ім, тым самым праводзілі права-апартуністычныя погляды і прымірэнцтва да нац-дэмакратызму.

Мы патрабуем ад катэдры марксізму-ленінізму ВАН перагляду работы і складу брыгады па праверцы часопісі «Н. К.»

Мы патрабуем ад ячэйкі КП(б)Б ВАН паставіць пытаньне аб памылках і падводзінах членаў партыі ячэйкі ВАН, удзельнічаючых у брыгадзе.

Мы лічым, што ў момант такой абвостранай клясавай барацьбы палобныя выступленьні ўзмацняюць пазыцыі клясавага ворага. Вось чаму яны зьяўляюцца асабліва небясьпечнымі і патрабуюць жорсткага адпору.

Гістарычная сэкцыя ад т-ва гісторыкаў-марксыстых брыгады па праверцы часопісі «Н. К.»

ЛЯЎКОВА.
ГУРВІЧ.
ЗЮЗЬКОЎ.

Менск 30 — 1930 года.

У паход за мэталь

Бурны рост нашай гаспадаркі, новыя фабрыкі, заводы, электра-станцыі, якія густой сеткай пакрываюць нашу краіну, — патрабуюць усё большай колькасьці мэталю. Капектывізаваная сельская гаспадарка, якая зараз перабудоўваецца на новай тэхнічнай базе, патрабуе дзесятнаў тысяч трактараў і многіх іншых складаных с.-г. машын. Усё гэта ў сваю чаргу зноў-такі павялічвае патрэбу ў мэталях.

Гэтым і тлумачыцца той дэфіцыт у мэталях, які адчуває зараз наша мэталюргічная прамысловасьць.

Каб насьціць нашы мартэны, зараз па ўсім Савецкім Саюзе праводзіцца ДЭКАДА ЗБОРУ МЭТАЛЯЛОМУ. У нас па БССР гэта дэкада праводзіцца з 1 па 10 сьнежня.

Ва ўдарным квартале БССР павінна дагрузіць мэталюргічным заводам 10.000 ТОН МЭТАЛЯЛОМУ. За кастрычнік і лістапад адгружана толькі 50 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. Засталося адгрузіць яшчэ 5.000 тон, што ва што-б там ні стала павінна быць выканана на працягу сьнежня. Дэкада збору лому, якая зараз пачалася, павінна адыграць у гэтым рашучую ролю. БССР павінна штодзенна адгружаць ПА 10 ВАГОНАЎ МЭТАЛЯЛОМУ.

Між тым, ход збору лому не гарантуе выкананьня заданьня. Так, згодна вестак Рудмэтальгандлю, гомельскі ЗАВОД «ПРАЛЕТАРЫ» замест 75 ТОН САБРАЎ ТОЛЬКІ 33,8 ТОНЫ, ЗАВОД «КАМУНАР» (Менск) замест 74 тон, сабраў 44,6 тоны, завод «ЧЫРВОНЫ АДРАДЖЭНЕЦ» (Ворша) замест 40 тон — сабраў 7,1 тоны. Ёсьць заводы, як, напрыклад, «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», «КАМІНТЭРН», ЯКІЯ НЕ САБРАЛІ НАВАТ НІ АДНЭЙ ТОНЫ ЛОМУ.

Дрэнна ідзе збор лому таксама па лініі Белдзяржгандлю і спажывецкай кааперацыі. Замест 850 ТОН, БЕЛДЗЯРЖГАНДАЛЬ САБРАЎ ТОЛЬКІ 85, спажывецкая кааперацыя ЗАМЕСТ 1.800 ТОН, САБРАЛА 180. Лепш ідзе збор на транспарце, але і там яшчэ далёка ня выкарыстаны вялізарнейшыя магчымасьці ў справе збору мэталёвага сырцу для нашых мэталюргічных заводаў.

Нельга ня спыніцца на нездавальняючым ходзе збору чугуну для мясцовай прамысловасьці. На працягу ўдарнага кварталу па БССР неабходна сабраць 800 ТОН ЧУГУНУ. Між тым, у кастрычніку замест 408 тон, сабрана ўсяго 81 тона.

Дэкада збору лому павінна ўзварушыць усю нашу грамадзкасьць на транспарце, заводах, фабрыках і на вёсцы.

Я. П—кі.

Па Савецкай Беларусі

Распрацаваць бураломны лес

ВІЦЕБСК, 3. 6-га лістапада гураганам было паломана і павалена шмат лесу. У некаторых мясцох колькасьць паваленага лесу перавышае разьмер гадавога карыстаньня. Калі ў лясох дзяржаўнага значэньня гэты лес распрацоўваецца, дык у лясох мясцовага значэньня да распрацоўкі яго дагэтуль яшчэ ня прыступлена. Такое становішча стварае пагрозу, што бураломны лес застанецца пад сьнегам і ўвесну будзе крыніцай распаўсюджаньня караедаў і інш. шасьціножак.

Трэба тэрміновa прыступіць да распрацоўкі бураломнага лесу і тым самым захаваць лясную гаспадарку ад зьнішчэньня.

РВК, сельсаветы і лесагарыстальнікі павінны неадкладна ўзяцца за работу.

Адказныя прафработнікі — на калдагаворную кампанію

Прэзыдыум ЦСПСБ камандураваў рад адказных прафработнікаў у буйныя прамысловыя цэнтры БССР (Гомель, Віцебск, Менск, Барысаў, Рэчыца і інш.) для правядзеньня калдагаворнай кампаніі.

Новая торфагаспадарка

Прэзыдыум ВСНГБ згадзіўся з праектам арганізацыі на Кабылянскім масыве торфагаспадарні магутнасьцю ў 400.000 тон. Торфагаспадарка будзе абслугоўваць новую гомельскую рабінную электрастанцыю.

1.200 пудоў кары—злачынка псуецца

МАЗЫР. Капцэвіцкая кааперацыя загатовіла 1.200 пудоў лазовай і дубовай кары. Гэта кара ўжо звыш месяца ляжыць на ст. **Васілеевічы** пад адкрытым небам. Вагоны для адгрузкі кары былі заказаны кааперацыяй на 26 верасьня, а даставілі кару — толькі 28 верасьня. У выніку кара ня была пагружана.

У інструкцыі паказана, што кару трэба хаваць ад сонца і вільготнасьці, бо яна ад гэтага псуецца. Аднак, гаспадарнікі ня лічацца з інструкцыяй і дапускаюць псаваньне каштоўнага матэрыялу. Адпаведныя арганізацыі павінны зацікавіцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

У адказ інтэрвэнтам

Прэзыдыум Бел. МБІТ у адказ школьнікам і інтэрвэнтам пастанавіў арганізаваць пры ўсіх ячэйках ІТР на прадпрыемствах бюро па распрацоўцы рабочых прапаноў і вынаходзтва. Кожны інжынэр або тэхнік павінен па працягу сьнежня ўнесьці ня менш аднэй рацыяналізатарскай прапановы на прадпрыемстве і працытаць ня менш 5 лекцый па вытворча-тэхнічных пытаньнях.

Курсы дарожных дзесятнікаў

Аўталор БССР адкрывае ў Менску з 15 сьнежня трохмесячныя курсы па падрыхтоўцы дарожных дзесятнікаў. Курсы разьлічаны на 60 чал.

Паведамленьні

— Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што 6 сьнежня ў 6 гадз. веч. ў памяшканьні ФРК КП(б)Б (заля пасяджэньняў) склікаецца нарада сакратароў вытворчых партканфлектываў і ячэек, агітмасавых працаўнікоў яч., старшынь праўленьняў клюбаў (партыйцаў), старшынь культкамісій, заг. сэктараў росту парт. ячэек. Парадак дня: 1) Аб перавыбарах гарсавету. 2) Аб росьце партыі. 3) Бягучыя справы. За своячасовую яўку паказаных вышэй т. т. нясуць адказнасьць сакратары партканфлектываў і ячэек.

— ЦСПСБ, Кастрычніцкі і Фрунзаўскі РК КП(б)Б склікаюць 6 сьнежня нараду па пытаньнях: 1) Падрыхтоўка да правядзеньня перавыбараў у гарсавет). (Дакл. ф-ка «Акцябрь», зав. «Камунар», Станц. камітэт чыг., абутк. ф-кі). 2) Аб сутавар. рабоце з вайсковымі часьцямі Чырвонай армії (дакл. зав. «Энэргія», «Бальшавік», друк. імя Сталіна і зав. «ДА»). На нараду павінны зьявіцца сакратары ячэек КП(б)Б, старшыні ФЗМК і прадстаўнікі вайсковых часьцей Чырвонай армії г. Менску. Нарада адбудзецца ў памяшканьні ЦСПСБ (заля пасяджэньняў) у 6 гадз. вечару.

— 6 сьнежня ў 7 гадз. вечару ў памяшканьні залі пасяджэньняў прэзыдыуму ЦСПСБ адбудзецца **нарада ўсіх загадчыкаў культсэктару ЦП саюзаў, культработнікаў ФЗМК і МК, загадчыкаў вячэрніх рабочых школ і вучастковых арганізатараў-мэтадыстаў па ліквідацыі няпісьменнасьці** па наступных пытаньнях: 1) Зімовы набор вячэрняй рабочай школы і ўдзел прафарганізацый у працы вячэрніх школ. 2) Ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Яўка для ўсіх памянёных т. т. абавязкова без спазьненьня.

— Кастрычніцкі РК КП(б)Б пра наступным т. т. абавязкова зьявіцца: памяшканьне РК (вул. К. Маркса 6 сьнежня ў 6 гадз. веч.: Карп Хаскін, Рудзіцкі, Кунін, Фі («Энэргія»), Шалюк, Гефен («Бальвік»), Гурло (наргас), Штэйнэр сындыкат), Аксельрод, Сьцяп гас), Гольдбэрг, Волкаў, Густы Кіршэнблюм, Лікарпенка («Бальвік»), Палякоўскі, Сьвірыдовіч, П (абутк. ф-ка), Апякін, Чыклай (ка Гершман (ЦКК РСІ), Улазаў (Дом масьветы), Альтман (ВДВ).

СЁНЬНЯ:

— ЦСПСБ. У 18 з пал. гадз. у пасядж. ЦСПСБ (Дом Працы, 3-гі верх, пак. 10) склікаецца агульна-к дзкі сход ІТР. Парадак дня: 1) Інф мацыя т. Каплана аб на-зачарго пленуме УсеМБІТ. 2) Абгаварэньне рапрыемстваў для рэалізацыі а УсеЦСПС і МОСПС «Наш адказ інт вэнтам».

— БАН. У 12 гадз., у памяшк. Б пак. 15, адбудзецца пасяджэньне гады літаратуразнаўства.

— Дом Асьветы. У 20 гадз. джэньне бюро юнсэкцыі прапасьв

— Дом Пісьменьніка. Сход мас назначаны на 4-XII, перанесіцца 9-XII у 7 гадз. веч. Запрашаюцца меньнікі і аўтары.

— ЦБ СНП. Апошні тэрмін пе гістрацыі навуковых працаўнікоў сьнежня. Навуковыя працаўнікі, не перарэгіструюцца, будуць лі механічна выбыўшымі з члена навуковых працаўнікоў.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

11 сьнежня у 19 гадз.

ЦСПСБ арганізуе РАДЫЁ-МІТЫНГ

па пытаньні аб удзеле прафсаюзаў у перавыбарах саветаў.

У мітынгу прымаюць удзел наступныя арганізацыі: ЦСПСБ, Добруская ф-ка «Герой Працы», Гомельскі ГПС, Мазырскі РПС, Слуцкі РПС, завод «Камунар», «Бальшавік», Рэчыцкі РПС, гута «Чырвоны Кастрычнік» і Бабруйскі РПС.

Масавы сэктар ЦСПСБ прапануе ўсім удзельнікам у мітынгу падрыхтаваць адпаведны матэрыял, які не пазьней 8-XII прысылаць ЦСПСБ, дагаварыўшыся раней з радыё-вузлам.

Сёньня, 5 сьнежня ў 7 гадз. веч. у памяшканьні ЦК МОПР'у (Савецкая, 87) адбудзецца

пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР.

Яўка для ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і членаў ЦК, якія знаходзяцца ў Менску, абавязкова.

Запрашаецца гаралзкі актыў.

Пасяджэньне фракцыі ў 6 гадз. веч.

ЦК МОПР'у БССР.

Культпроп ЦК КП(б)Б сёньня, 5-га сьнежня, у 6 з пал. гадз. вечара, (у пакоі № 16 склікае.

нараду камуністых, якія працуюць у галіне савецкага будаўніцтва і права.

Парадак дня: Аб стварэньні таварыства марксыстых дзяржаўнікаў-прававікоў. На нараду запрашаюцца навуковыя работнікі, асьпіранты і кіруючыя практычныя работнікі ў галіне савецкага будаўніцтва.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЛКСМБ

З прычыны перанесеньня Ўсесаюзнага зьезду ЎсеЛКСМ і скліканьня сесіі ЦВК на 10-XII-30 г.,

Х-ы Ўсебеларускі зьезд ЛКСМБ

ПЕРАНОСІЦЦА

з 15-XII-30 г. на 3-1—31 г.

Крычаўскі РК КП(б)Б і рэдакцыя газ. «ЗЬВЯЗДА»

скліканць

у аўторак, 9 сьнежня, а 12 г. дня у памяшканьні крычаўскага Дому Культуры

РАЁННУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

рабселькораў і членаў рэдкалегій насьц. газэт.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

Аб выданьні крычаўскай раённай газэты і задачах рабселькораў.

На канфэрэнцыю запрашаюцца ўсе члены насьцегазэт рэдкалегій і рабселькоры Крычаўскага раёну.

Крычаўскі РК КП(б)Б, рэдакцыя газ. «ЗЬВЯЗДА»

КЛЮБ ІМЯ КАРЛА МАРКСА

Для членаў прафсэюзаў ПАНЯДЗЕЛАК, 8 СЬНЕЖНЯ, АЎТОРАК, 9 СЬНЕЖНЯ

Вечар камэрнай песьні

Вядомая сьпявачка

Веры ДУХОЎСКАЯ (МАСКВА) || **М. БІХТЭР** (ЛЕНІНГРАД)

У праграме: МУСОРСКІ, РЫМСКІ-КАРСАКОЎ, фрагмэнты з опэр і рамансы.

Білеты прадаюцца выключна праз тэатр. рабочую касу. Пачатак канцэрту ад 6 гадз. у клюбе Карла Маркса. Білеты на калектыўных заўвагах фабзаўкомаў і месцкомаў у колькасьці на ня менш 20 білетаў даецца **скідка 25 проц.**

ПАЧАТАК КАНЦЭРТУ ў 8 г. 30 м.

Адказны распарад. БЕЛ. АДДЗ. ОАФІЛУ.

ЗОА-ВЫСТАЎКА ЗЬВЯРЫНЕЦ

ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, рог Ленінскай

адкрыта штодзенна з 8 г. ран. да 11 г. увеч.

ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ:

леў, леапард, гіена палосатая, гіена плямістая, вары, мядзьведзі, рысь, мурэўсы, дзікабразы, барсукі, алень, вярблюд, аслы, прадаўзі, 20 малп і шмат іншае зьвярыны.

Школам і экскурсіям—льготная плата, скідка 40 проц.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

1931 г. | **НЕ ЖДИТЕ** ПОСЛЕДНИХ ДНЕЙ ПОДПИСНОГО СРОКА **ПОДПИШИТЕСЬ** теперь же на 1931 г. | **1931 г.**

Парт., проф. и общественные организации, библиотеки, фабрики, заводы, колхозы, совхозы, вузы, институты и все органы культурного строит. страны.

ежемесяч. общ.-полит. журнал

Инженеры, техники, научные работники, студенты, врачи, агрономы, педагоги; культур-уполномоченные в колхозах и совхозах, работники на фронте культурн. революции

„ВАРНИТСО“

(Боевой орган передовой советской интеллигенции).

ЗАДАЧИ ВАРНИТСО:

Объединение революционного сектора советской трудовой интеллигенции, решительное искоренение вредительства, борьба с правыми группами и аполитичностью среди интеллигенции. Постоянное и практическое содействие партии и рабочему классу в деле социалистического строительства, борьба за выполнение промфинпланов. Всемерное, активное содействие проведению всех мероприятий по подготовке и изучн. кадров.

Непосредственное участие в деле культурного строительства страны.

Пропаганда марксизма-ленинизма среди широких масс специалистов и деятелей культурного фронта.

В журнале имеются следующие отделы: 1) общ.-полит., 2) промышленность и транспорт, 3) коллективизация сельск. хоз., 4) подгот. кадров, 5) борьба на идеол. фр., 6) среди инженеров и техников; среди научных работников, 7) за рубежом, научн. и культ. связь с интеллигенц. Запада, 8) хроника корреспонд., 9) офиц. отдел.

Все учреждения и отдельные лица, состоящие подписчиками на журнал —возобновите теперь же подписку—не выжидая последних 4 ей подписного срока, в целях бесперебойной доставки Вам журнала.

Подписная цена: для учреждений и организаций на год 12 р., полгода—7 р., для индивидуальных подписчиков на год—6 р., полгода—3 р. 50 к.

Подписку направлять по адресу: Москва, ГСП 2, Ильинка, Юшков пер., 6-3. Редакция журнала «ВАРНИТСО».

Подписка принимается также всеми отделениями и уполномоч. Госиздата, всеми почтовыми отделениями и письмоносцами и всеми коллективами и отделениями ВАРНИТСО при предприятиях и учреждениях и всеми уполномоченными газеты «Гудок» на транспорте.

1-шае ў БССР гуравае кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

2-я гукавая праграма **„Алімпіяда мастацтваў“** Гукавы кіно-агляд у 4 частках **„ПОШТА“** палітычная у 2-й частках. Каса—ад 4 гадз. увеч. У пачатак сэансаў—6, 7 з пал., 9, 10 з пал. гадз.

Кіно-тэатр „Культура“

З прычыны вялікага посьпеху **другі тыдзень НЯНАВІСЬЦЬ** Эпапэя ў 8-мі актах. Пачатак дзен. сэансаў а 1 гадз. і 2-ой 50 м., вячорніх—а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“

Гістарычны фільм **ПАЛОНЬНІК КАЎКАЗУ** (па Ю. Лермантаў) Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса—ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары“

Сіда Чаплін у зэмежным фільме **МАЛПАВА ВІДОВІШЧА** Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. Каса—ад 4 з пал. гадз. веч.

Кіно „ЮНЫ ЛІЯНЭР“

Гістарычны фільм **Тарас Шаўчэнка** ў 2-х сэрыях. Пачатак 1-га сэансу ў 1 гадз. дня. Каса—ад 11 гадз. 30 м.

КІНО „Партак“

2-я АГУЛЬНАЯ СЭРЫЯ **НІБЭЛУНГІ** (Помста Крымгільды). Трагедыя ў 10 част. Пачатак сэансаў: 6 г. 30 м., 8 г. 30 м., 10 г. 30 м. Каса адчынена з 4 г. 30 м. дня

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ПАДПІШЭЦЕСЯ на 1931 ГОД

на штомесячную літаратурна-мастацкую і грамадзка-палітычную часопісь

„МАЛАДНЯК“

орган Беларускай Асоцыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў

«МАЛАДНЯК» зьяўляецца баявой часопісьсю ў барацьбе за пралетарскую літаратуру, нацыянальную па форме і пралетарскую па зьмесьце.

IX ГОД ВЫД.

«МАЛАДНЯК» мае мэтай даць чытачу мастацкія твовы, якія адбівалі-б эпоху вялікага сацыялістычнага будаўніцтва

„МАЛАДНЯК“ на сваіх старонках будзе і надалей рашуча праводзіць цьвёрдую бальшавіцкую лінію ў галіне літаратуры, рашуча змагацца з усякімі хістаньнямі, ухіламі, шкодным тэндэнцыямі і варожымі ўхіламі ў літаратуры і змагацца за бальёв згуртаваньне радоў беларускай пралетарскай літаратуры.

„МАЛАДНЯК“ у 1931 г. зьмесьціць рад артыкулаў па пытаньнях пралетарскага мастацтва і творчых дасягненьняў беларускай пралетарскай культуры, а таксама літаратуры братніх рэспублік.

Лепшыя сілы пралетарскай літаратуры і марксыцкай крытыкі ўдзельнічаюць у „МАЛАДНЯКУ“.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На 1 год. 5 руб. На 6 мес. 3 руб. На 3 мес. 1 р. 50 к. Асобны нум. 50 коп.

Падпіска прымаецца: у аддзеле падпісных і перыядычных выданьняў БДВ, Менск, Савецкая, 79, кіёскамі, кнігарнямі і ўпаўнаважнымі БДВ. ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і вагонах спажывецкай кааперацыі

Аддзел падпісных і перыядычных выданьняў.

Галоўны бухгальтар ШУКАЕ МЕСЦА. Мае салідны стаж вытв. гр. будаўн. і с.-г. бухгальтэры з эканамічным ухілам. Прапановы накіроўваць: Менская п-т. кантора, да запатрабаваньня П. Ф. Гучку.

ЗЬБЕГЛА НЯМЕЦКАЯ АЎЧАРКА (сука) сьветла шэрага колеру. Просьба да затрымаўшага сабаку зьвярнуць па адрасу: аб'яднаная беларуская вайсковая школа, т. Шчаглову.

ЗЯМЛЯ

Рэжысэр А. ДОЎЖАНКА. Апэратар Д. ДЭМУЦКІ.

Газэта «ПРАЎДА» аб 29-III—1930 г. пра карціну «ЗЯМЛЯ»:

«Фільм «ЗЯМЛЯ», бясспрэчна, зьяўляецца адным з буйнейшых і найарыгінальнейшых твораў савецкага мастацтва»...

ЗЯМЛЯ

Рэжысэр А. ДОЎЖАНКА. Апэратар Д. ДЭМУЦКІ.

«НАША ГАЗЭТА» аб 2-IV—1930 г. пра карціну «ЗЯМЛЯ»:

«...Пра яе спрачаюцца, з карцінай не згаджаюцца, з яе запэўненьнямі палемізуюць. З адным усе згаджаюцца—«ЗЯМЛЯ»—буйнейшае зьявішча ў савецкай кінематаграфіі. «ЗЯМЛЯ»—паварот у нашым кіно-мастацтве, маяк, які паказвае новы шлях савецкага кіно».

ЗЯМЛЯ

Рэжысэр А. ДОЎЖАНКА. Апэратар Д. ДЭМУЦКІ.

Газэта «ВЕЧЭРНЯЯ МОСКВА» пра карціну «ЗЯМЛЯ»:

«ЗЯМЛЯ»—вялікае заваяваньне савецкага кіно... На шляху разьвіцьця савецкага кіно, на шляху стварэньня пралетарскага стылю ў кіно-«ЗЯМЛЯ» зьяўляецца неабходным і каштоўным этапам»...

СЛУШАЙТЕ ГОВОРИТ МОСКВА

ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА 1931 г. НА ЖУРНАЛ

„ГОВОРИТ МОСКВА“

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ: на год—6 р.—к., на 6 м.—3 р. 25 к., на 3 м.—1 р. 70 к., на 1 м.—р. 60 к. Цена отдельного номера 20 к. ПОДПИСКА принимается всюду на почте, письмоносцами и издательством НКПТ. Москва, 9, Тверская, 17. Требуйте журнал «ГОВОРИТ МОСКВА» во всех киосках

4-й год издания. Выходит 3 раза в месяц (по декадам).

Иллюстрированный массовый журнал „ГОВОРИТ МОСКВА“ является органом широкой пролетарской радиообщественности.

В журнале помещаются подробные программы наиболее слушаемых советских и заграничных радиовещательных станций. К программам даются подробные комментарии и множество иллюстраций.

„ГОВОРИТ МОСКВА“ освещает также основные вопросы реконструкции радиотехнической базы, новости науки и техники в области радио, заграничный опыт и т. д.

Каждый радиослушатель должен подписаться на журнал

„ГОВОРИТ МОСКВА“

ДЭРЖБАНК І БЕЛЖЫЛСАЮЗ

даводзіць да ведама ўсіх пайшчыкаў і кватэранаймальнікаў ЖАКТ'аў і ЖБКТ, што яны могуць аплаціць КВАТЭРНУЮ ПЛАТУ, паявы і інш. узносы шляхам падпісаньня заяў на прадстаўляемых рахунках ЖАКТ'аў на імя сваіх прадпрыемстваў і ўстаноў на прадмет **безнаяўнага пералічэньня** з іх зарплаты на рахунак ЖАКТ'аў і ЖБКТ

Прадпрыемствы і ўстановы гэтыя заявы падаюць Дэржбанку пры агульнай заяве для пералічэньня на належныя рахункі.

Дэржбанк.
Белжылсаюз.

КАНЧАТКОВЫ ТЭРМІН

перарэгістрацыі наборных і дзіцячых кніжак МЦРК—8 сьнежня.

Усе грамадзяне, якія не пасьпелі прайсьці перарэгістрацыю ў ЖАКТ'ах, праходзяць у пунктах сваіх раёнаў міліцыі.

ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК.

Менскае Гарадзкое і аваярыства Паляўнічых

даводзіць да ведама, што

перарэгістрацыя паляўнічых

на 1931 год

СКОНЧЫЦЦА 31-га СЬНЕЖНЯ 1930 г.

Пасьля 1 студзеня 1931 г. паляўнічыя, якія не перарэгістраваліся, трацяць права на валоданьне і хаваньне зброі.

Праўленьне Менгар. т-ва Паляўнічых.

ПАТРЭБНЫ

рыбаводы і гідратэхнік

на арганізацыі рыбе-гадоўлевых гаспадарак.

УМОВЫ ПЛАТЫ ПА ЗГОДЗЕ.

Зварачацца ў сэктар кадраў Белкампасаюзу.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ“ прымаюцца да 2 гадз. дня

Мінск. друкарня «Зьвязды»

Менск. Гапоўлітбел 337